Антон Міранові ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

На шляху да Пана Бога ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 23 (2769) Год LIV | Беласток, 7 чэрвеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Студзіводскае свята

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Стваральнік Міжнароднага падляшска-палескага фестывалю традыцыйнага фальклору „Там по маёвуй росі" Дарафей Фіёнік не спадзяваўся такога росквіту невялікага мерапрыемства, якое пачалося з кароткіх сустрэч з веснавым фальклорам. Пасля ў рамках фестывалю сталі прэзентавацца штораз то новыя прапановы і мерапрыемства ўпісалася ў бельскі краявід і стала разыходзіцца ў розныя мясцовасці Бельшчыны і Гайнаўшчыны. У час сёлетняга шостага выпуску фестывалю, які з 28 па 31 мая праходзіў у Студзіводах, Бельску і Моры, аб'яднанне „Музей Малой айчыны ў Студзіводах" паставіла як на выпрабаваныя формы паказу фальклору, так і выйшла з новымі прапановамі прэзентацыі народных творцаў і іх спадчыны.

Супольны выступ „Жэмэрвы" з „Арэшкамі" паказаў магутнасць народнага спеву

З новымі прапановамі

Два першыя дні фестывалю распачыналіся менавіта з новых прапаноў. У бельскім ратушным музеі адбылося адкрыццё выстаўкі народных творцаў Берасцейшчыны (сябраў клуба „Скарб"). На наступны дзень у Музеі Малой айчыны ў Студзіводах адбылося адкрыццё выставы скульптур і малюнкаў Івана Супрунчыка з Цярэбліч (Столінскі раён) і наладжаны былі майстар-класы, у якіх прынялі ўдзел творцы з Рэспублікі Беларусь. Прадаўжаліся яны і ў час фальклорнага канцэрта.

— Сярод нас многа асоб, якія працуюць з дрэвам, Анатоль Туркоў з Камянца, Вячаслаў Дародзька з Кобрына і, зразумела, Іван Супрунчык, — пералічваў вядомы беларускі мастак Уладзімір Чыквін, які таксама працаваў з сякеркай у дрэве. — Работы Святланы Панасюк гэта бісер, Марыя Марчук выконвае пісанкі і займаецца бацікам. Марыя Кулецкая з Пружан займаецца роспісам на шкле, Наталля Крывіцкая выконвае керамічныя вырабы, а Мікола Шэлест займаецца ганчарствам.

Мікола Шэлест з Гароднай (Столінскі раён) якраз выконваў збанкі. Дапамагаў яму вучань Сяргей Шэлест.

— На маіх работах паказваю нараджэнне, жыццё і паміранне. Звяртаю ўвагу на агонь, хлеб і ваду, якія спадарожнічаюць чалавечаму жыццю, — сказаў Іван Супрунчык у час адкрыцця яго індывідуальнай выставы скульптур і каляровых малюнкаў у Студзіводскім музеі. Праспяваў ён з жонкай дзве песні, інаўгуруючы песенную частку фестывалю.

Іншым ад традыцыйных прапаноў быў таксама канцэрт народных або стылізаваных на народныя капэлаў. У гэтым годзе ўдала запрэзентаваліся капэла „Вэрэнька" са Стахава (Столінскі раён) і калектыў „Рада" з Мінска, які ўзначальвае Алесь Лось. Капэла з маладымі выканаўцамі пачала дзейнічаць таксама пры студзіводскім музеі. Вялікае ўражанне зрабіў на прысутных сямейны калектыў „Клінтсаў" з Латвіі, які спяваў па-латышску ў суправаджэнні вельмі старых інструментаў.

Абрады „куста", „вяселля", песні і танцы...

Аднак асноўная частка фестывалю традыцыйна пачалася карагодам абрада „куста", характэрнага веснавому фальклору. Удзельнікі фестывалю з песнямі і танцамі прайшлі вуліцамі Студзіводаў. На наступны дзень адбыўся канцэрт, заўважальную частку якога займаў веснавы фальклор. У гэтым годзе арганізатары запрасілі калектыў „Журавушка" з Атвержыч (Столінскі раён) і трыо сясцёр Лук'яновічанак з Леснікоў (Драгічынскі раён). У рэпертуары гэтых беларускіх калектываў былі веснавыя і летнія песні. Многа разоў на сцэну выходзілі прадстаўнікі мясцовага калектыву „Жэмэрва". Старэйшая і малодшая групы дзяўчат спявалі запісаныя на Бельшчыне і Гайнаўшчыне песні, выступала капэла і мужчынскі калектыў хлопцаў, якія займаюцца ў танцавальнай групе „Жэмэрвы".

— „Жэмэрва" пачынала вучыцца народнага спеву ад „Арэшкаў" і таму разам з арэшкаўскім калектывам заспявае песню „Там за лесам, за борам", — заявіў Дарафей Фіёнік, які традыцыйна вёў мерапрыемства. Супольны выступ атрымаўся ўдала. „Арэшкі" выступілі таксама самастойна з жартоўнай сцэнкай. З фальклорным рэпертуарам выступілі „Збучанкі", а сола — іх кіраўнік Кацярына Ціханюк.

— Мы бачым, што ў рэпертуары калектываў з Палесся многа невядомых нам песень. У іх таксама ёсць свой адметны напеў, свае мелодыі і, зразумела, іншае вымаўленне, — разважала кіраўнік „Арэшак" Надзея Грушэўская. У час канцэрта на сцэне паявіліся таксама дашкольнікі і вучні з бельскай „тройкі", калектыў „АБ-БА" з Беластока, Лукаш Барташук з песнямі з Сухавольцаў.

Ужо ад некалькіх гадоў на фестывалі паказваецца вясельны абрад, але за кожным разам ён здаецца непаўторным. Або паказваюцца дэталёва не тыя самыя кампаненты, якія складаюцца на абрад „вяселля", або ўводзяцца новыя адметнасці, характэрныя як для розных раёнаў Палесся, так і нашага Падляшша.

— У час вясельнага абраду мы паказваем „спавіванне маладой" і будзем перакідвацца хустачкай над маладой і прасіць для яе блаславенства на сямейнае жыццё, — заявіла кіраўнік калектыву „Журавушка" Люба Яхнавец. — У нас, на Палессі, гэты абрад хіба захаваўся толькі ў нашай вёсцы Атвержычы.

Сёстры Лук'яновічанкі ў час вясельнага абраду ўпрыгожвалі, а пасля дзялілі каравай.

— У нас, што вёска, дык свае адметнасці ў вясельным абрадзе, таму не дзіва, што наш вясельны абрад адрозніваецца ад вашага, — сказала Валянціна Лук'яновіч. Цэлы вясельны абрад, як і фальклорны канцэрт прэзентаваліся перад невялікай публікай. Камерныя абставіны гэта вялікая каштоўнасць студзіводскага фестывалю, бо сярод невялікай публікі ствараласа і прэзентавалася народная творчасць у мінулым. Аднак трэба ж паказаць народныя каштоўнасці і больш масавай публіцы і таму выканаўцы штогод выступаюць у цэнтры Бельска. Сёлета запрэзентаваліся таксама жыхарам Мора.

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск Падляшскі • Сяматычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

ЗАПРАШАЕ

Сардэчна запрашаем на прэзентацыю артыстычнай творчасці дзяцей і моладзі, якая адбудзецца 05.06.2009 г. у 17.00 у ВААК („Сподкі") па вул. св. Роха 14 у Беластоку

Праграма:

I. 17.00-19.00 Артыстычная частка

1. Спектаклі ў выкананні ўдзельнікаў тэатральнага гуртка „Гульня ў тэатр": „Казка пра рыцара без каня", „Прыгоды трох парасят", „Брыдкае качаня".

2. Дзіцячая група Студыі аўтэнтычнага беларускага фальклору „Я нарадзіўся тут".

3. „Вялікае Княства Літоўскае — наша супольная спадчына".

II. 19.00-19.15 Развітанне з вучнямі, якія канчаюць пачатковую школу, гімназію і ліцэй.

III. 19.15-19.45 Канцэрт гурту „Клюквы".

Малебен за дзяцей і моладзь, якія вывучаюць беларускую мову, адбудзецца 04.06.2009 г. у 17.00 у царкве св. Юр'я ў Беластоку.

ЗАПРАШЭННЕ

Кафедра беларускай культуры, Філалагічны факультэт Універсітэта ў Беластоку запрашаюць 4 чэрвеня г.г. на даклад з цыкла Беларускія чацвяргі:

д-ра Міраслава Янковяка — „Беларускія сцежкі ў Латвіі".

Пачатак: г. 17.00, вул. Лінярскага 3, з. 1 В, Беласток

Левыя кандыдаты

На фоне мінска-крамлёўскіх інтэграцыйна-сяброўскіх заляцанняў і сварак уладароў „чырвоных дамоў" „брацкіх рэспублік", што навідавоку для ўсіх грамадзян Беларусі, на другім плане застаюцца жарсці ў апазіцыйных колах краіны. А між тым яны крыху неспадзявана (у сэнсе, што раней, чым думалася) разгараюцца не на жарты. Публіцыстычны артыкул Міхаіла Падаляка „Отбеливатель М", які спярша з'явіўся ў інтэрнэце, а потым быў надрукаваны ў газеце „Народная воля" літаральна скалануў дэмакратычныя колы. І істотна прыспешыў, паскорыў працэсы, якія да гэтага развіваліся спакваля. Цяпер ідуць зацятыя спрэчкі ў сферы вылучэння адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад апазіцыйных сіл. Адны кінуліся зацята бараніць Аляксандра Мілінкевіча, іншыя амаль дэманізаваць яго асобу. Як той казаў, пайшло-паехала. Цяпер адны будуць праводзіць чэрвеньскі кангрэс праеўрапейскіх сіл, іншыя рыхтуюцца да аналагічнага восеньскага. Амаль як у той пушкінскай казцы: „Хто Еўропе больш статней — Статкевіч? Хто Еўропе больш мілей — Мілінкевіч?" Трэція, якія ўжо ў відавочнай меншасці, слушна даводзяць, што трэба праводзіць, як і раней, кангрэс Аб'яднаных дэмакратычных сіл, паколькі гэтая структура нікуды не праваліласа ў зямлю і неяк існуе. Разабрацца ў гэтых калізіях нават дэмакратычным актывістам на месцах, а тым больш шараговаму выбаршчыку папросту немажліва. Памятаеце як казаў булгакаўскі літаратурны герой: „Пішуць, пішуць: кангрэс, немцы нейкія". У такой сітуацыі звычайныя выбаршчыкі знаходзяць простае рашэнне.

Больш за іншых пацешыла партыя Беларускага народнага фронту, старэйшая і ў нядаўнім мінулым мацнейшая дэмакратычная партыя. Ледзь не два гады цвердзілі пра вылучэнне свайго партыйнага кандыдата, называлі нейкія прозвішчы, рыхтавалі свой праймерыз. І во на табе — паловай альбо ледзь не большай часткай БНФ заяўляе пра падтрымку ўсё таго ж старшыні „Руху за свабоду". Ужо і ўнутраны новы лідар з'явіўся, які павядзе партыю адзіным безвыходным шляхам. Праўдападобна, што Вінцук Вячорка, які зараз вырас у досыць моцнага палітыка, свой час упусціў. Старая фронтаўская гвардыя трывае адступленне перад ціскам „маладых ваўкоў і ваўчанят". Што датычыць Мілінкевіча, то ён вельмі шмат прайграў у вачах ангажаванага беларускага электарату тым, што не падпісаў звароту да еўрапейскіх структур, які супольна склалі Івонка Сурвіла, Станіслаў Шушкевіч, Зянон Пазьняк і Аляксандр Казулін.

Справа бітвы за адзінага кандыдата ад апазіцыі ўжо каторы год разгортваецца так, што раней старыя людзі сказалі б пра гэта так: „Не гадзілі б свету!" Ужо цяпер для кожнага, хто хоць крыху знаёмы з айчыннай палітычнай кухняй, відавочна, што беларуская апазіцыя не будзе ў 2011 г. мець ні такога „адзінага" як Мілінкевіч у 2006 г., ні нават такога „адзінага" як Ганчарык у 2001 г. Занадта шмат і „дэкаратыўных" прэтэндэнтаў у новыя лідары — Гайдукевіч ужо можа адпачываць. Калі кандыдатаў многа, значыць, гэта некаму трэба... Усе будучыя сцэнарыі ўдзелу беларускай апазіцыі ў наступных прэзідэнцкіх выбарах — гэта зноў сцэнарыі трэніроўкі, працы з народам, спробы сіл, у кожным разе праекты пачэснай паразы, але ніяк не сцэнарыі перамогі і прынцыповых змен.

Выглядае на тое, што ў Беларусі сапраўды няма правых палітыкаў. Бо чым розняцца правыя палітыкі ад левых? Калі адкінуць паліталагічныя тонкасці і тое, што запісана ў партыйных праграмах, то на маю думку дзвюма істотнымі рэчамі. Тым, што правыя палітыкі, па-першае, гавораць заўсёды тое, што думаюць, а па-другое (і гэта галоўнае), заўсёды трымаюць сваё слова і выконваюць дамоўленасці. З іншага боку, для левых галоўнае — папулізм і дасягненне сваіх мэт кожным шляхам. У сучасным слэнгу слова „левы" мае яшчэ адно значанне. „Левы" ў моладзевым моўным асяродку — гэта значыць „выпадковы", „нягеглы", „неадпаведны", „несур'ёзны". Крызіс лідараў беларускай дэмакратычнай апазіцыі дасягнуў крытычнай мяжы, за якой толькі поўная анархія і апатыя актывістаў.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Родам з Беласточчыны

Прафесар і герой Пятро Буйко

Доктар медыцынскіх навук, прафесар, Герой Савецкага Саюза Пятро Буйко пахаваны ў вёсцы Тамашоўка Фастаўскага раёна Кіеўскай вобласці. На магіле ўстаноўлены помнік. Яго імя носіць Тамашоўская сярэдняя школа і адна з вуліц у Кіеве. Імя прафесара было нададзена і Кіеўскаму інстытуту акушэрства і гінекалогіі, але пасля развалу Савецкага Саюза гэты інстытут „згубіў" яго імя, а мемарыяльная шыльда з фасада будынку кудысьці знікла...

Тым не менш, памяць пра Пятра Буйко на Украіне жыве. Кожны год у кастрычніку студэнты і выкладчыкі Нацыянальнага ўкраінскага медыцынскага ўніверсітэта імя Багамольца выязджаюць на Фастаўшчыну, каб прыбраць магілу нашага земляка і прынесці кветкі. Уступныя лекцыі на некаторых кафедрах акушэрства і гінекалогіі ў медыцынскіх вышэйшых навучальных установах Украіны традыцыйна пачынаюцца з расказу пра Пятра Буйко. Некалі нават у тэатры імя Івана Франко з вялікім поспехам ішла п'еса Якава Баша „Прафесар Буйко"...

Пятро Буйко нарадзіўся 31 кастрычніка 1895 года ў беларускай сям'і ў Бельску-Падляшскім Падляшскага ваяводства. У гады Першай сусветнай вайны быў прызваны на фронт у якасці ваенфельчара. Потым удзельнічаў у Грамадзянскай вайне. А калі адбыў свой воінскі доўг, паступіў у Кіеўскі медыцынскі інстытут, які скончыў у 1922 годзе, атрымаўшы спецыяльнасць акушэр-гінеколаг.

З 1933 года наш зямляк узначаліў Кіеўскі інстытут аховы мацярынства і дзяцінства (цяпер ён называецца Інстытут педыятрыі, акушэрства і гінекалогіі Акадэміі медыцынскіх навук Украіны). У 1939 годзе Пятро Буйко абараняе доктарскую дысертацыю і становіцца прафесарам кафедры акушэрства і гінекалогіі № 2 гэтага медыцынскага інстытута. У сваіх працах ён разглядае пытанні прафілактыкі і тэрапіі разрываў прамежнасці пры родах (1938 г.), а таксама займаецца лячэннем пухірна-похвенных свішчаў (1940 г.). Прафесар Буйко, напрыклад, прапанаваў метад фістулаграфіі пры гэтай складанай паталогіі з гоматрансплантацыяй плацэнты на ўшыты дэфект мачавога пухіра. Але паспяховую практыку акушэра, вучонага, хірурга ў галіне рода дапамогі спыніла Другая сусветная вайна.

У чэрвені 1941 года Пятро Буйко добраахвотнікам пайшоў на фронт вядучым хірургам медсанбата. Але праз некалькі месяцаў пад Уманню трапіў у палон. У час перагону яму, цяжка параненаму, удалося ўцячы ад калоны палонных. Яго хавалі і лячылі мясцовыя жыхары-ўкраінцы. А калі трохі ачуняў, Пятро стаў працаваць доктарам у Фастаўскім шпіталі, але аб тым, што ён доктар медыцынскіх навук і прафесар, ніхто не ведаў. У шпіталі наш зямляк лячыў мясцовых жыхароў, а таксама немцаў. Ён вельмі хутка заваяваў давер і сярод украінскага насельніцтва, і сярод гітлераўцаў.

Працуючы доктарам у шпіталі, Буйко пачаў супрацоўнічаць з мясцовымі партызанамі, даваў ім інфармацыі, атрыманыя ад немцаў, якія там лячыліся. Адначасова Пятро Буйко многім украінцам „рабіў хваробы", дзеля таго, каб іх не вывозілі на працу ў Нямеччыну. Але ў пачатку 1943 года гестапа прасачыла і раскрыла ўсю яго працу на карысць і мясцовых жыхароў, і партызан. Праўда, прафесару ўдалося ўцячы. Ён узяў каня з возам, наклаў у воз лекаў, хірургічных інструментаў і знік у лесе.

Аднойчы Пятра Буйко вяскоўцы паклікалі на аперацыю ў Тамашоўку. Ён пагадзіўся і прыехаў дапамагчы. Але нехта выдаў прафесара: падчас аперацыі ў хату ўварваліся гітлераўцы і арыштавалі доктара. Яго доўга дапытвалі, а пасля кінулі ў хлеў, куды былі сагнаныя вяскоўцы, якія падазраваліся ў сувязі з партызанамі. У хляве затрыманыя людзі зрабілі вялікую шчыліну і прапанавалі прафесару ўцячы. Але ён адмовіўся, бо немцы папярэдзілі, калі хто ўцячэ, спаляць усю вёску. Тады гітлераўцы побач з хлявом запалілі адну хату, куды і кінулі звязанага доктара. Здарылася гэта 15 кастрычніка 1943 года.

У 1944 годзе Пятру Буйко было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Гэта быў першы ўказ, падпісаны старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Міхаілам Калініным, у якім узвышаўся подзвіг аборонцы Айчыны на часова захопленай германскімі войскамі зямлі. Калінін тады сказаў, што наш народ ніколі не забудзе імя гэтага слаўнага прадстаўніка савецкай інтэлігенцыі, які знайшоў мужнасць і сілу, каб стаць у рады супраціўлення, нягледзячы на штодзённую небяспеку быць захопленым ворагам.

Сяргей ЧЫГРЫН

Вачыма еўрапейца

Спольшчаны зубр

На апошняй сесіі Падляшскага самаўрадавага сейміка радныя абмяркоўвалі спосабы прамоцыі ваяводства на працягу найбліжэйшых гадоў. Спецыяльна на гэтую патрэбу адна з маркетынгавых фірм парабіла аналізы, кансультацыі і да г.п., а ўсё для таго, каб Падляшша было прыцягальным рэгіёнам і для турыстаў, і саміх жыхароў. І так з даследаванняў і грамадскіх кансультацый вынікае, напрыклад, што візітнай карткай ваяводства з'яўляюцца па чарзе: прырода, зубр, малочная прамысловасць, шматкультурнасць. З другога боку, побач гэтых тузоў пералічаны быў канкрэтна падляшскі сыр. Што мае „пернік да ветрака", як кажуць палякі, значыць, шматкультурнасць да сыру, — сам чухаюся па галаве.

Ключавая, аднак, ідэя (пуцяводная думка) — як гэта было адзначана — маркі Падляшскага ваяводства змешчана ў лозунгу: „Багатая разнароднасць". Аўтары дакумента звяртаюць увагу на пагрозы пры стварэнні адлюстравання рэгіёна, якія вынікаюць з унутраных падзелаў, значыць, з факту, што Падляшскае ваяводства не з'яўляецца аднародным, толькі складаецца з адменных у культурным плане Падляшша і Сувальшчыны. Аналітыкі звяртаюць увагу на неабходнасць фармавання мышлення аб Падляшскім ваяводстве ў катэгорыях „брамы на Усход", а не „ўсходняй сцяны". Прапануюць, каб у нашым ваяводстве ўзнік Музей крэсаў, паколькі Падляшша, на іх думку, гэта „стражнік крэсаў". „Паколькі толькі гэты рэгіён, з усяе г.зв. Усходняй Польшчы, захаваў жывую повязь з крэсавай традыцыяй (Ольштын гэта былая Усходняя Прусія, Люблін цягнецца да Мазовіі, Жэшаў распаложаны задалёка на захад, прытым павязаны з традыцыяй Галіцыі, Кельцы ўвогуле на павінны разглядацца ў гэтым кантэксце)", — заяўляюць аўтары дакумента. Зараз пасля адзначаюць прытым, што „калектыў звяртае аднак увагу на нейкія небяспекі палітычнай натуры — з боку некаторых, палітычна карэктных, асяроддзяў у краіне можа прагучаць папрок у „рэваншызме". Трэба выразна адзначыць, што маем на думцы памяць і традыцыю, што Падляшскае ваяводства хоча быць „стражнікам памяці", а не „маршыраваць на Коўна".

З іншых прапанаваных аналітыкамі канкрэтаў цікава можа прагучаць у вушах чытачоў „Нівы" такая вось заява наконт лагатыпа ваяводства, якога галоўным элементам з'яўляецца зубр: „Наша рэкамендацыя: намаляваць зубра нанова. У новай версіі павінен ён несці сімвалічныя асацыяцыі, што выканаўца лічыць ключавым, з пальшчызнай. Зубр гэта польская жывёла, а Падляшскае ваяводства гэта сапраўдная Польшча". Цікава, што на гэта сказалі б зубры з беларускага боку Белавежскай пушчы?

З журналісцкага пункту гледжання незвычайна цікавымі з'яўляюцца ўказанні наконт супрацоўніцтва ў рамках прамоцыі ваяводства якраз з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі. І так, улады ваяводства павінны арганізаваць сустрэчы з журналістамі ў вядомых і прызнаных гатэлях ці рэстаранах. Мелі б яны форму сняданкаў, але толькі для — як акрэслена — адабраных журналістаў. Пэўна гаворка аб тых, што не ядуць зашмат. Намякаецца таксама, што кожны з удзельнікаў такой сустрэчы мае атрымаць нейкі падарунак, па-за матэрыяламі дакладна інфармацыйнымі. Супольнае ранішняе спажыванне ежы мае на мэце „будаванне пазітыўных адносін з журналістамі і прадстаўлянне найважнейшых з пункту гледжання медыяў інфармацый". А мне гэта папахвае хабарніцтвам. У прынцыпе я не павінен так пісаць, бо ўжо цяпер напэўна ваяводская ўлада не адбярэ мяне, а і прэзенты мяне абмінуць!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Размова з Антонам Мірановічам, незалежным кандыдатам са спіса Грамадзянскай платформы ў Еўрапарламент у выбарах 7 чэрвеня

Праваслаўе ў Еўрасаюзе

„Ніва": — *Ці еўрапейская супольнасць гэта толькі палітычна-эканамічны арганізм?*

Антон Мірановіч: — Абсалютна, не. Гэта цывілізаваная, культурная супольнасць, якая сёння адыгрывае штораз большую ролю ў гэтым разнародным свеце. І мае яна істотную ролю для адыграння ва ўсёй цывілізацыі. Гэта перш за ўсё вялікая міжнародная грамадскасць, якая аказвае агромны ўплыў на вобраз нашай планеты.

— ***А якія каштоўнасці, праз уваход Балгарыі, Румыніі, а раней Кіпра, а ў будучыні іншых праваслаўных краін, можа ўнесці ў Еўрасаюз праваслаўе?***

— Еўрапейская тоеснасць збудаваная на чатырох слупах — на эліністычнай грэцкай цывілізацыі, рымскім правадаўстве, на ўкладзе паасобных народаў у агульнаеўрапейскую спадчыну, і, вядома, хрысціянстве. Большасць асоб просіць дадаць яшчэ іудзея-хрысціянства, паколькі яўрэйская грамадскасць адыграла ў гісторыі Еўропы вялікую, а ў некаторых рэгіёнах вельмі значную ролю. У выпадку хрысціянства — яно атаясамліваецца не толькі з веравызнаннем, але і з пэўным цывілізацыйным колам, якое ёсць у Еўропе — гаворка тут пра візантыйскую, візантыйска-славянскую цывілізацыю, якая сёння ўспрымаецца ў Еўропе як хрысціянская цывілізацыя з дамінуючай роляй праваслаўя.

— ***У такіх краінах, як успрыманая свецкай Францыя, прынамсі ёсць такія галасы, што ў Еўропе няма такіх духоўных каштоўнасцей, якія маглі б яе з'яднаць. Гэтак гаварыў м.інш. а. Юрый Койла. Ці пагаджаецеся Вы з такім тэзісам?***

— Абсалютна не пагаджаюся з гэтым поглядам, таму што калі нават гаворым пра свецкасць Францыі, мусім памятаць аб тым, што ўся французская культура, яе нацыянальнасць абапіраюцца на глыбокі хрысціянскі дух, у гэтым выпадку лацінскі. Невыпадкова Францыю называлі „найбольшай, найстарэйшай дачкой Касцёла", якая ў істотны сросаб фармавала не толькі вобраз раманскіх краін, але перш за ўсё вобраз усёй сярэдняй і заходняй Еўропы, перш за ўсё Еўропы духу. Там дзе хрысціянская Еўропа, з каштоўнасцямі глыбока прасякнутымі рэлігійнасцю, стварала рэчаіснасць не толькі на сваім кантыненце, але і шляхам каланіяльных заваёў стварыла цэлую прастору хрысціянскага свету па-за еўрапейскім кантынентам. Памятаем, што ўздзеянне хрысціянскіх каштоўнасцей датычыць не толькі Еўропы. Немагчымая ўява канфесійнай сітуацыі хоць бы ў Лацінскай Амерыцы без улічэння таго ўплыву, які ўчынілі іспанцы, партугальцы ці французы. Еўропа ў сваіх каранях абапіраецца на хрысціянства. Але сёння гэты погляд мусіць быць крыху праверены. Наплылі новыя рэлігійныя, цывілізацыйныя групы, якія паяўляюцца на старым канытненце; маю тут на думцы перш за ўсё шматлікую мусульманскую грамадаскасць у шмат якіх еўрапейскіх асяродках, таксама індускую, але і іншыя рэлігіі, больш акцыдэнцыялістычныя, спірытуалістычныя, з Далёкага Усходу.

— ***Якое месца павінны мець Касцёлы ў еўрапейскай канстытуцыі? Як гэты запіс у еўрапейскай канстытуцыі меў бы адносіцца да ўнутраных запісаў паміж Касцёламі і нацыянальнымі дзяржавамі?***

— Сённяшнія дэмакратычныя тэндэнцыі, раздзел Касцёла ад дзяржавы стаў стандартам еўрапейскіх каштоўнасцей для еўрапейскай дзяржавы. Не значыць гэта, аднак, што Касцёлы не павінны адыгрываць ролі ў публічным жыцці ці нават фармаваць дзяржаўны лад краіны. Калі паглядзім на нейкія запісы, скажам у польскай канстытуцыі, ці ў Іспаніі, дзе адбываецца вялікая дэбата над правам на аборты, дык Касцёлы адгрываюць вельмі вялікую ролю — абараняюць тыя каштоўнасці, якія вякамі ўшаноўваліся ў Еўропе. Трэба, аднак, адназначна сказаць, што Касцёлы не мусяць кшалтаваць рэчаіснасці — гэта ўся грамадскасць вырашае аб канчатковым кшталце і характары дзяржавы — ці гэта дзяржава свецкая ці рэлігійная. Сёння ў Еўропе няма шанцаў на рэлігійную дзяржаву. Мне здаецца, што Касцёлы не маюць права на тое, каб узурпаваць сабе права вырашаць аб дзяржаўным ладзе краіны, грамадскім жыцці, абычаі агулу грамадзян. Сёння ў Еўропе няма ніякай дзяржавы з дамінацыяй адной рэлігіі, дзе адна рэлігія кшталтуе вобраз усяго грамадства. Нават калі хтосьці дэкларуе, што з'яўляецца веруючай асобай, дык у сваіх штодзённых паводзінах кіруецца логікай і нормамі дэмакратычнай дзяржавы, з павагай для іншых, а таксама для няверуючых, для матэрыяльнага свету; сам, дарэчы, удзельнічае ў гэтым свеце. Касцёлы адыгрываюць важную ролю, але не з'яўляюцца суб'**ектамі**, якія вырашаюць аб вобразе сучаснага еўрапейскага грамадства.

— ***Наколькі Касцёлы, таксама і праваслаўны, павінны або могуць ангажавацца ў палітычнае жыццё еўрапейскіх структур?***

— Касцёл мае права і павінен выказваць сваю пазіцыю ў абароне універсальных каштоўнасцей, такіх як стасунак да праўды, фальшу, сямейных каштоўнасцей, норм паводзін у публічным жыцці, мае права выказаць свой пункт гледжання. Касцёлы дзейнічаюць у Еўрасаюзе па-за ўнутранымі падзеламі, і голас праваслаўя, як і каталіцызму, у шмат якіх справах — аднолькавы. Я хачу сказаць універсальную праўду. Як я ўжо сказаў, Касцёлы маюць права і абавязак выказаць свой погляд, але канчаткова гэта еўрапейскія эліты і грамадствы вырашаюць аб тым, якія юрыдычныя нормы маюць у гэтым грамадстве захоўвацца. Памятаем: яшчэ на пачатку XX стагоддзя жанчыны ўвогуле не дапускаліся да голасу. Сёння, пасля „эмансіпацыі" свету, жанчыны адыгрываюць штораз большую ролю. Сёння вяртанне да нейкіх традыцый, якія былі адабраныя Касцёлам і абычаем як непарушныя нормы, практычна немагчымае. Сёння роля шматлікіх грамадскіх груп, таксама і жанчын, але і іншых згуртаванняў, таварыстваў, таксама з левацкім ці розным па абычаю характарам, адабраецца большай часткай еўрапейскага грамадства. Ніякія наказы, парадкі, асабліва ў прымяненні юрыдычных норм, не могуць абмяжоўваць гэтых груп. Я, хоць сам стаю на пазіцыі хрысціянскіх норм у сваім і публічным, і прыватным жыцці, лічу аднак, што варта даць шанц на тое, каб гэтыя дэмакратычныя нормы сталі падставай, а не былі ўвесь час пад пагрозай. Трэба дадаць адно: грамадствы мяняюцца. Кожнае пакаленне, генерацыя ўносяць новыя змены, новыя каштоўнасці. Не ведаю, ці гэтыя нашы дыскусіі, якія мы вядзем, будуць актуальнымі праз 50-60 гадоў. Могуць яны стаць паўсюдна абавязваючай нормай. Можам тады толькі з гістарычнага пункту гледжання аналізаваць тыя спрэчкі, ідэалагічныя дыспуты.

— ***Ці лічыце Вы, так як ставіць Касцёл, а і Праваслаўная царква таксама, што рэлятывізм з'яўляецца пагрозай для еўрасаюзнай грамадскасці, для еўрасаюзных краін?***

— Так, з'яўляецца ён нейкай пагрозай, таму што розныя ацэнкі гэтых самых з'яў з розных пунктаў гледжання заўсёды даводзяць да таго, што маем дачыненне з разнароднасцю падыходаў да аднае справы. Тое, што з'яўляецца магчымым у адной краіне, у другой можа не адабрацца. Міжнародная грамадскасць шляхам СМІ часта дэзінфармуецца. Падзеі ў краіне, якія маюць невялікае значэнне калі справа ў выніках, перабольшваюцца, і тады міжнародная грамадскасць можа рэагаваць лішне востра, з усімі паслядоўнасцямі міжнародных юрыдычных норм. У іншым выпадку справа прамоўчваецца. На маю думку, на жаль, у Еўропе дамінуе дазвол на самавольства ў выпадку вялікіх дзяржаў і народаў, затое паводзіны і пазіцыі малых груп выклікаюць вострую, часам завострую, рэакцыю еўрапейскіх і грамадскасцей, і ўрадаў. Рэлятывізм павінны мы абмяркоўваць не толькі пры ацэнцы палітычных ці нацыянальных адносін. Я звярнуў бы таксама ўвагу на этычныя паводзіны. Мне здаецца, што мы ў Еўропе ўжо перасягнулі нейкія бар'еры. Нейкія этычныя паводзіны, якія павінны стаць нормай для палітычнага класа, не захоўваюцца ў некаторых краінах. Тое, напрыклад, што адабраецца і трактуецца як норма ў палітычным жыцці ў Польшчы, несумненна не адабраецца, скажам, у Вялікабрытаніі. Павінны мы імкнуцца да нейкага кансенсусу, калі гаворка пра паводзіны эліт, таксама ў этычна-маральным сэнсе.

— ***Неаднаразова патрыярхаты, якія маюць прадстаўніцтвы пры Еўрасаюзе, але таксама і Канстанцінопальскі патрыярх, ставілі пытанне беднасці. Ці Еўрасаюз выпрацаваў нейкі стандарт перамагання беднасці, вырашання гэтай праблемы, і ці магчымым у гэтым плане якраз тут было садзейнічаць з Касцёламі?***

— Сапраўды, пазіцыя Канстанцінопальскага патрыярха знамянальная і асаблівая на фоне ўсіх хрысціянскіх супольнасцей. Не толькі пытанне беднасці, але і экалагічныя пытанні выношаныя неаднаразова патрыярхатам прымаюцца вельмі пазітыўна. Касцёлы не могуць абыякава падыходзіць да сучасных еўрапейскіх праблем, такіх як беднасць, або да эмігрантаў, якія прыбываюць у Еўропу. Еўрасаюз ставіцца адкрыта да падтрымкі не толькі тым краінам, якія маюць на сваёй тэрыторыі значны лік эмігрантаў, але і пазаеўрапейскіх краін. Еўрасаюз выдаткоўвае вялікія фінансавыя сродкі на падтрымку афрыканскіх, азіяцкіх краін, між інш., на перамаганне беднасці. Часта размеркаванне гэтай дапамогі адбываецца праз арганізацыі рэлігійнага характару, Касцёлы. Гаворым тут аб чымсьці больш глабальным. Касцёлы могуць не толькі шляхам маральнага націску, але і заклікаў да сумленняў, да хрысціянскіх каштоўнасцей сваіх вернікаў патрабаваць нейкіх палітычных рашэнняў дзеля большай фінансавай дапамогі ўбогім краінам і людзям. Касцёлы на сваіх асамблеях вельмі часта вяртаюцца да гэтай тэмы і ў выпадку некаторых краін, дзякуючы такім заклікам, удалося здабыць вялікія фінансавыя сродкі на гуманітарную дапамогу ці падтрымку ўбогіх краін.

— ***Што значыць у праваслаўі паняцце адкрытага грамадства?***

— Гэтае паняцце не вельмі папулярнае ў праваслаўі. Таму што дэмакратыя, разуметая ў грэцкім грамадстве, праваслаўі інакш успрымаецца хоць бы праз кансерватыўную пазіцыю некаторых іерархаў, якія лічаць, што штосьці такое як дэмакратыя ў Царкве ўвогуле не павінна існаваць. Праваслаўе гэта іерархічная структура, уфармаваная па кананічным арганізацыйным прынцыпе. Усё ж здаецца мне, што голас грамадскасці верных павінен быць чутны ў розных Касцёлах, таксама і ў Праваслаўнай царкве. Думка вернікаў аб паставе не толькі ў адносінах да сучаснага свету, аб дускусіі аб дапамозе, ангажаванню Царквы ў вырашэнне розных праблем павінна быць пачута іерархамі. Адкрытае грамадства гэта таксама пазіцыя адкрытасці і ангажавання ў розныя пытанні, не толькі светапоглядавага, ідэалагічнага характару, а перш за ўсё грамадскага. Дапамога грамадзе, працягненне адкрытай далоні на розныя праблемы, не толькі ва ўласным асяроддзі.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Як даехаць у Саўляны?

Вёска Саўляны распаложаная побач Беластока, усяго 2 км ад ваяводскай метраполіі. Належыць яна да Супрасльскай гміны. У гэтым напрамку ездзяць аўтобусы гарадской камунікацыі — лініі № 13, але яны канчаюць свой аб'езд ля цяпліцы па вул. 27 Ліпеня ў Беластоку.

У Саўляны, асабліва па суботах і нядзелях, яны заязджаюць рэдка: раптам чатыры разы — два да поўдня і столькі ж пасля абедзеннага часу. Таму і жыхарам Саўлян найчасцей прыходзіцца падавацца ў горад пехатой. Што тыя чатыры курсы! А вось на канцавы прыпынак лініі „13" каля цяпліцы аўтобус прыязджае 35 разоў па суботах і нядзелях ды 40 разоў у буднія дні.

Так вось па ўсім відаць, што супрасльскія гарадскія ўлады не вельмі клапоцяцца пра тое, каб жыхарам Саўлян жылося выгадней. Не дамовіліся з Камунальным камунікацыйным прадпрыемствам у Беластоку, каб гарадскі аўтобус у выхадныя дні ў Саўляны ездзіў прынамсі восем разоў. Аўтару гэтага допісу вядома і тое, што Саўляны не маюць свайго раднага ў Гарадской радзе ў Супраслі. І мабыць таму няма каму хадайнічаць у гэтай справе перад уладамі Супрасльскай гміны.

Нараўчанская гміна

На нашых дарогах

Пра дарогі неабходна ўвесь час клапаціцца. У Нараўчанскай гміне пра гэта не забываюць.

З Лешукоў адна дарога бяжыць да ваяводскай артэрыі Навасады — Нараўка — Новае Ляўкова — Юшкаў Груд. Яе даўжыня — 4 км. Значная частка гэтай дарогі вядзе цераз лес і мае яна ў лесе гравейную маставую. Зараз — вясной — пусцілі па ёй грэйдар і цяпер жвіроўка роўная. Па ёй добра і бяспечна ехаць.

Варта задбаць пра што іншае. На некторых адрэзках Лешуцкай дарогі не толькі ў равах, а нават ля маставой выраслі суцэльнай сцяной кустарнікі. Ад гэтага яна павужэла. Кусты неабходна ссячы. І яшчэ адно. Перад адным з паваротаў у лесе стаіць паржавелы дарожны знак і нічому ён не служыць. На ім злушчылася фарба і ў значнай ступені ўжо адпала. Толькі можна дадумацца, што гэта асцерагальны знак (!), бо мае ён форму трохкутніка! **(яц)**

Вясковыя крыжы

Калі знаходжуся ў той ці іншай мясцовасці, з вялікай увагай прыглядаюся вясковым крыжам. Наогул да гэтых помнікаў пры нашых вёсках жыхары ставяцца вельмі дбайна — абгароджаны яны металічным або драўляным плотам, у агароджы растуць або стаяць у вазонах кветкі, гараць, калі трэба, лампадкі. Люба на гэта глядзець.

Але сустракаюцца і такія вёскі, у якіх вяскоўцы быццам забылі аб помніках сваіх продкаў. Там вакол крыжоў відаць непарадак. Выглядае, што быццам яны спадзяюцца на кагосьці іншага. У такім выпадку на каго? І таму, шаноўныя тутэйшыя беларусы, давайце дбаць пра чысціню і парадак вакол нашых вясковых крыжоў. Гэта ж да іх праводзілі ў апошнюю дарогу нашых продкаў, перад імі спыняюцца, здымаюць шапкі, хрысцяцца і моляцца прахожыя. **В.Б.**

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Па міжмежжы

Пакідаю поезд на прыпынку Кундзін і падаюся ў бок Панятовіч. Халодны веснавы ранак, бо ж акурат выпадае дзень аднаго з „халодных агароднікаў". Іду аптымістычна гладкай асфальтоўкай, бо ж яшчэ і сонейка схіляе ў цёплым напрамку. Але тая асфальтоўка неўзабаве, за ўзгоркам, канчаецца. Асфальт быццам нарокам пакладзены бліжэй чыгункі, па якой праязджаюць міжнародныя цягнікі, быццам быў гэта пацёмкінаўскі асфальт, які прыкрывае нябачную за ўзгоркамі іншую рэчаіснасць, пыльную жвіроўку.

Жвіроўка пралягае галоўным чынам між палямі, лясоў навокал мала, амаль не відаць самасеяў і аблагоў. Тамашнія людзі, на абшары паміж Саколкай і Адэльскам, шануюць зямельку-карміліцу больш чым, напрыклад, між Гайнаўкай і Сямятычамі. Мо ў іх склаўся іншы менталітэт?..

Цалкам магчыма, бо ж пражываючае на ўсход ад Саколкі насельніцтва каталіцкага веравызнання і да таго ж непахісна лічыць сябе палякамі, хаця ў побыце карыстаецца яшчэ чыстай беларускай мовай. Ці гэта дастаткова для дыферэнцыравання менталітэту?

Энцыкліка Яна Паўла II „Laborem Exercens" з верасня 1981 года прысвечаная працы. Польскі папа сцвярджаў, што чалавек на досвітку свайго існавання атрымаў ад Творцы загад падпарадкоўваць сабе зямлю. Гэтае падпарадкоўванне найбольш праяўляецца ў працэсе земляробства і ператварання яго прадуктаў для свайго карыстання. Значыць, земляробства астаецца асноўнай галіной дзейнасці чалавека, істоты, створанай на вобраз Божы. Але земляробства становіцца таксама прычынай шматлікіх клопатаў, у іх ліку непрэстыжнасці, і схіляе да адрачэння ад яго, ад спадчыннай зямлі, да адрачэння ад свайго асяроддзя, ад сваёй культуры, мовы, традыцыі... Не парадаксальна хіба, што словы энцыклікі апісваюць той працэс, у які, здаецца, тутэйшыя праваслаўныя рвануліся намнога шпарчэй за тутэйшых адрасатаў папскага паслання.

Згадаў я пра непрэстыжнасць і крыху затрымаюся на гэтай тэме. У 1722 годзе маскоўскі цар Пётр увёў у сваёй дзяржаве „Табель аб рангах"; гэты нарматыўны акт вызначаў рангі чыноўнікаў. Аднак у маскоўскай дзяржаве ёсць і іншыя нарматывы, якія з'яўляюцца сакрэтам палішынеля. Адным з такіх сакрэтаў з'яўляецца каціроўка рабоў. Адны рабы маюць у крамлёўскіх уладароў нейкі прэстыж, іншыя яго не маюць зусім. Для прыкладу вазьму спярша палякаў, якія сто гадоў пасля цара Пятра трапілі амаль поўнасцю пад маскоўскае панаванне. І там яны ў агульнасці выконвалі ролю эмісараў еўрапейскасці, таму карысталіся свайго роду прэстыжам, пра што, напрыклад, могуць сведчыць пецярбургска-маскоўскія кар'еры Адама Чартарыйскага ці Фелікса Дзяржынскага. Рабам іншых нацыянальнасцей так соладка не было і пра іхні прэстыж у гаспадароў Крамля не прыходзіцца гаварыць. Прыгадаю, для прыкладу, апошнюю сусветную вайну, калі Масква шчодра кідала сваіх рабоў у ваенную мясамолку, найперш на перадавую, аб'явіўшы іх да гэтага здраднікамі і прадажнікамі. А з палякамі зноў было інакш; Катынь тут быў адно толькі эпізадычным выключэннем. І так выходзіць, што ў зоне маскоўскага панавання заўсёды прэстыжней і выгадней дэкларавацца палякамі, асабліва тым, хто ў аднаверстве з імі. І складваць менталітэт, сістэму светаўспрымання, па польскі лад...

Панятовічы не засяроджаныя ў вёсцы, шмат тут хутароў. Але многія хаты недалёка ад галоўнай жвіроўкі. Не ўсе тыя хаты заселены, ёсць і безгаспадарныя, якія зарастаюць, пару хат развальваецца. Але палі абрабляюцца, нават вузкія палоскі абсеяны. Блізу дарогі можна пабачыць драўляныя стэлы з каплічкамі; мяркую, што ў дахрысціянскі час на палях ставілі такія ж стэлы з чатырохтварымі стараславянскімі ідаламі наверсе. У вёсцы некалькі гаспадароў трымае статкі кароў. Побач вуліцы студня з разбітым цэментным кругам, але з дзеючым калаўротам. Гаспадар інфармуе мяне, што ваду з гэтай студні скарыстоўваюць для паліванння агарода, а для іншых мэт карыстаецца вадой з нядаўна пракладзенага водаправода.

Крыху далей заўважаю аддалены ад вуліцы комплекс будынкаў, які мне падаецца былым эскаэрам. Напатканы селянін пацвярджае маю здагадку, інфармуючы, што цяпер будынкамі карыстаецца прыватнік, трымаючы ў іх угнаенні і ўраджай. Рэліктаў колішняй калектывізацыі вёсак, такіх як аборы ці вялікія свіраны, якія ёсць у амаль кожнай вёсцы вакол Бельска, тут не відаць; мабыць, менталітэт мясцовага насельніцтва быў не надта перспектыўны для калектывізацыйных праектаў.

Заходжу ў Заспічы. Адкуль назва вёскі — мабыць ад спіц, мабыць, калісь тут былі майстры па вырабе кол для вазоў. У Заспічах, так як і ў іншых вёсках, відаць сляды той эканамічнай буры, якая пракацілася ў нас апошнімі гадамі. Некаторыя гаспадаркі асталіся на плаву, іншыя не справіліся з новымі абставінамі. Вясковы клуб, мабыць у былым школьным будынку, паказвае, што ёсць тут крыху моладзі — бо хто ж бы іншы ў ім павыбіваў шыбы ў вокнах...

Між межамі поле дбайна абсеянае

У Номіках вялікі драўляны школьны будынак чакае новага гаспадара. Заняткі былі спынены там каля пяці гадоў таму. Цяпер сямёра дзяцей з Номік даязджае ў падставоўку ў Малявічы, а дзесяцёра ў гімназію ў Саколку.

Пытаю напатканых вяскоўцаў пра пункт прыёму малака, што побач былой школы. Адказваюць, што пункт гэты працуе, прымае сырадой. Але не абыходзіцца без нараканняў, а нават лаянкі ў адрас цяперашніх сельскагаспадарчых парадкаў, на па-



Касцёл у Клімаўцы

дзенне цэн сельскагаспадарчых прадуктаў і на рост цэн мінеральных угнаенняў, бо гэтыя працэсы пазбаўляюць вяскоўцаў прыстойнай перспектывы. Бо Номікі, нягледзячы на непасрэднае прыляганне да дзяржаўнай мяжы, выглядаюць даволі прыстойна, людзі тут трымаюцца гаспадарак, жыве тут каля паўсотні сем'яў ды і лік моладзі паказвае, што мала хто збіраўся пакідаць сваю бацькаўшчыну. І нават буслоў тут шмат — каля тузіна гнёздаў.

Паміж Номікамі і Клімаўкай стаіць у шчырым полі прыдарожны каменны крыж, пастаўлены ў 1931 годзе жыхаром вёскі Чарноўшчына Францішкам Цілюлькам. Да вайны паміж Скраблякамі, Грабянямі (абедзве гэтыя мясцовасці цяпер у межах Беларусі), Номікамі і Клімаўкай была вёсачка Чарноўшчына, але ў 1944 годзе, калі сюдою пралягла польска-савецкая граніца, Чарноўшчына апынулася на савецкім баку ўпрытык з гэтай новай гранічнай лініяй і саветы гэтую вёску папросту знеслі. Астаўся па ёй толькі каменны крыж у шчырым полі...

Клімаўка сёння з'яўляецца парафіяльнай вёскай, тут ёсць касцёл. У гэтага касцёла цікавае мінулае. У канцы XVII стагоддзя ў Клімаўцы быў заснаваны кляштар дамініканцаў і пабудаваны драўляны Троіцкі касцёл, на месцы якога ў 1760 годзе быў пабудаваны новы. Касцёл той згарэў у 1838 годзе, пасля ліквідацыі царскай адміністрацыяй кляштара і парафіі ў 1832 годзе. У 1862 годзе была там узведзена каменная каталіцкая каплічка, якую чатыры гады пазней царскія ўлады забралі католікам і аддалі праваслаўным. Гэтае рашэнне гродзенскі губернатар тлумачыў тым, што дазвол быў на пабудову драўлянай грабніцы над магілай продкаў памешчыка Імбры з Талочкаў, а ён без патрэбнага дазволу ўлад пабудаваў каменную капліцу, якая стала філіяльнай Адэльскай парафіі. Храм быў далучаны да Кузніцкага прыхода, перабудаваны на царкоўны лад з іканастасам і ў 1882 годзе атрымаў ён новых патронаў — Пятра і Паўла. У 1919 годзе храм вярнуўся да католікаў, зноў стала тут парафія, а касцёл прайшоў чарговую рэканструкцыю ў 1927-1928 гадах. У 1944 годзе Клімаўка апынулася ў межах Савецкага Саюза, аднак мясцовы касцёл, нягледзячы на вельмі блізкае суседства граніцы, неяк уцалеў і прастаяў да 1948 года, да г.зв. карэкты польска-савецкай граніцы...

Карэкта дзяржаўнай польска-савецкай мяжы была спланавана ў 1947 годзе, а адбылася ў палове мая наступнага года; на адрэзку між Саколкай і Гроднам граніца была перасунута ад ста метраў да трох кіламетраў на ўсход. Такім чынам у межах Польшчы апынулася частка вёскі Рагачы за Новым Дваром і цэлая вёска Хварасцяны. На поўдзень ад Кузніцы да Польшчы адышлі вёскі Навадзель, Толчы, Шымакі і Клімаўка. Да Польшчы была таксама далучана тэрыторыя вёскі Палесціна, якую да вайны насялялі яўрэі, ды вёскі Номікі, Мінкоўцы, Усінар-Горны, Грыбоўшчына і Юраўляны...

Кароткі курс гісторыі

Край дарогі з Клімаўкі ў Толчы шмат крыжоў, замацаваны яны нават на дрэвах. На адным з каменных крыжоў, што перад Толчамі, арыгінальны надпіс: „Jeźli kto chce za mną iść niech sam siebie zaprze i weźmie krzyż swój a naśladuje mnie 1914". Вёска Толчы выглядае крыху інакш чым ранейшыя, яна ўжо занепадае. Магчыма, што прычынай таму дотык граніцы, якая аддалена ад будынкаў адно на некалькі дзесяткаў метраў. Ды і частка ранейшых вясковых грунтаў апынулася на другім баку граніцы.

І вёска Навадзель таксама выглядае сумнавата, не відаць тут новага подыху. Тут таксама граніца недалёка, каля ста метраў ад клуняў, таксама частка ранейшых вясковых палёў асталася за граніцай. Людзі абрабляюць яшчэ тут зямельку, але вёска збіраецца згортвацца; прыкмеціў я некалькі пажылых жанчын у ролях касцоў. Адносіны да зямлі яшчэ дбайныя, яшчэ людзі абрабляюць тут яе літаральна аж да гранічных слупоў. Інакш выглядае гэтая справа з усходняга боку дзяржаўнай мяжы — там да граніцы падыходзіць адно лес; магчыма, што саветы абсадзілі граніцу, каб польскія кулакі не падглядалі і не зайздросцілі райскага жыцця тамашнім калгаснікам...

Пасярэдзіне Навадзелі дарожны знак паведамляе пра прысутнасць мнагадзетнай установы. Школьны будынак знаходзіцца тут на ўзгорку на загуменні вёскі. Ён яшчэ рэлятыўна новы, магчыма, што гэта адна з „тысячагодак", пабудаваных у Польшчы пры Гамулцы. Ад напатканай жанчыны прабаваў я нечага больш даведацца пра ейную вёску, але яна ўсяго „не ведала", аднак выявіла мне адну строга сакрэтную тайну: школа ў Навадзелі не працуе ўжо можа з пятнаццаць гадоў. Жыве ў ёй нейкі вайсковец і мо таму будынак — з гімнастычнай залай! — захоўваецца ў належным стане. Менш шыкарна выглядае будынак пункта прыёму малака, які паволі абрастае прыродай.

Край дарогі між Навадзеллю і Кузніцай з мінулага года стаіць металічны крыж, надпіс на якім паведамляе пра неадлеглае мінулае гэтай тэрыторыі, пра той узнёслы настрой насельніцтва ў момант адмены яго савецкага падданства на польскае грамадзянства.

Сустрэча пенсіянераў

Восьмае мая многім гайнаўскім пенсіянерам запомніцца надоўга. У гэтую сонечную пятніцу дырэкцыя Самастойнай публічнай установы аховы здароўя запрасіла ў Гайнаўскі дом культуры сваіх былых працаўнікоў — больш за 300 чалавек — на сустрэчу. Госці сустрэліся за багата застаўленымі сталамі.

Дырэктар Самастойнай публічнай установы аховы здароўя ў Гайнаўцы Рыгор Тамашук шчыра прывітаў сваіх былых медыцынскіх працаўнікоў і дэталёва пазнаёміў іх з дзейнасцю службы аховы здароўя на Гайнаўшчыне ў цяперашні час. Прысутны на сустрэчы стараста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук адзначыў, што дырэктар Тамашук з'яўляецца адным з найлепшых дырэктараў у ваяводстве, а нават у краіне. Пенсіянеры падзякавалі дырэктару за паспяховае кіраванне іх былой установай.

Пасля адбылася мастацкая частка. Першай выступіла 8-гадовая салістка Кася Дружба, затым на сцэну выйшаў калектыў Студыі песні пад кірункам Марты Грэдэль. З народнымі танцамі выступіў калектыў „Перапёлка" пад кірункам Юстыны Каліноўскай, а праграму заверышыла выступленне калектыву „Тройка" пад кіраўніцтвам Малгажаты Кнот. Усе згаданыя калектывы карыстаюцца вялікай папулярнасцю, паколькі ў сваім рэпертуары маюць беларускія песні і танцы. Таму іх выступленні суправаджаліся бурнымі апладысментамі.

Пенсіянеры ад дырэкцыі Самастойнай публічнай установы аховы здароўя атрымалі каштоўныя падарункі, што іх вельмі ўзрадавала. Чарговае такое спатканне — праз год.

Віктар БУРА

Дзе турыстам выкідаць смецце?

Чыноўнікі вырашылі завесці чысціню і парадак ва ўсіх вёсках Міхалоўскай гміны. Таму забралі з вёсак вялікія кантэйнеры, у якія жыхары складалі ўсялякае смецце, і ўвялі абавязак падпісаць з камунальным прадпрыемствам дамову на вываз бытавых адходаў. Цяпер на кожным панадворку павінен стаяць малы кантэйнер і за яго апаражненне трэба плаціць адпаведную стаўку. Прытым апрацавалі дамову з дванаццаці параграфаў, у якой амаль усё зроблена пад камунальнікаў (прапаную ім забіраць смецце ў белых пальчатках).

Калі вялікія кантэйнеры агульнага карыстання размешчаны былі вакол вёсак і Семяноўскага вадасховішча, карысталіся імі турысты і вудзільшчыкі, якія масава наведваюць гэтую старонку. А сёння звычайнаму турысту смецце прыходзіцца выкідаць абы-дзе. На думку многіх турыстаў міхалоўскія чыноўнікі павінны ўзяць прыклад з улад суседняй Нараўчанскай гміны. Там у публічных месцах стаяць кантэйнеры агульнага карыстання, да таго яшчэ для паасобнага збору смецця — шкла, пластмасы і макулатуры. Нездарма войт Нараўчанскай гміны славіцца гаспадарнасцю. Брава!

Д. Д.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Мая бабуля размаўляе па-беларуску!

Рэдакцыя „Нівы”, сонечны поўдзень, 20 мая г.г.

— Добрыыыыыы дзеееееень! — чуецца працяглае гучнае прывітанне...

— Калі, ласка, заходзьце! — сустракае пані Галінка. Я таксама адрываюся ад камп’ютара і выходжу сустракаць. Да нас завіталі дзеткі з праваслаўнай школы ў Беластоку. Усе яны вывучаюць беларускую мову ў якасці дадатковага ўрока. Разам тры настаўніцы. Няпроста дапільнаваць такую жывую, вясёлую грамадачку.

— А я ўжо быў у вас! — заяўляе Патрык, выпускнік беларускага садка. Сапраўды, час ад часу, наведваюць нас дзеткі з прадшколля, хоць большасць у „Ніве” ўпершыню. Ім усё тут цікава. Спачатку дзеці аглядаюць сталы, дзе звычайна шмат картак, слоўнікаў і газет на беларускай мове. Цікавасць выклікае беларускі алфавіт на экранах камп’ютараў. І сцены — дзе ўсюды паліцы з беларускімі кніжкамі і часопісамі.

— А ці нехта з вас размаўляе з бацькамі па-беларуску? — пытаем сяброў...

— Мой дзед так размаўляе! — заяўляе нехта.

— І мая бабця размаўляе па-беларуску! — чуецца падобны голас.

У школе імя Кірылы і Мяфодзія вывучаюць тры ўсходнеславянскія мовы: беларускую, украінскую і рускую. На іх спяваюць песні і дэкламуюць вершы. І, вядома, актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх дзіцячых конкурсах і фестывалях Беласточчыны. Часам выступаюць у зялёна-чырвоных касцюмах (падараваных ім з Мінска).

— Тады і нам заспявайце беларускую песню, — прапануем нашым госцейкам.

У адказ усе глянулі на Гжэся Зінчука. Рыгорка свайго роду класны завадатар і запявала. Спачатку ён завёў украінскую песню, а калі скончыў — беларускую. Пра сабаку Чапу, у якога забалела лапа...

— А хто вас навучыў так прыгожа спяваць? — хвалім расспяваных дзетак.

— Пан Шэмет, — заяўляюць гучным хорам.

У школе шмат мастацкіх гурткоў, сярод якіх і музычня заняткі, якія вядзе вядомы музыкант і кампазітар Генадзь Шэмет. У праваслаўнай школе ўсяго чатырнаццаць вучняў. Беларускай мове вучыць іх спадарыня Альжбета Рудкоўская, якая працуе таксама ў беластоцкай гімназіі № 7.

Фота і тэкст: ЗОРКА

Зайздросны сабака

Бег Лыска па кладцы цераз рэчку, а ў зубах нёс кавалак мяса. Калі гляне, аж у вадзе другі такі самы сабака і таксама нясе кавалак мяса. Стала Лыску зайздросна; кінуўся ў рэчку адбіраць тое мяса, а сваё з зубоў выпусціў і згубіў.

Аляксандр Смоліч — „Чытанка для дзіцячага садка”

У касцюме ці без?

(працяг з 22 н-ра)

Вельмі спантанна рэагавала публіка таксама на рокменаў з беластоцкага гурту „Клюквы” ці на вясёлы, як сонца, калектыў „Казка” з Гарадка, які запрашаў ужо сваіх сяброў ды публіку на канікулы. Гэта якраз была моладзь, якая прэзентавалася без народных касцюмаў, пра што пару слоў і сказала журы. Але ці напэўна, каб спяваць па-беларуску сучасныя песні, патрэбная такая вопратка? Адзін з музычных кіраўнікоў Генадзь Шэмет, які, дарэчы, рыхтаваў на сцэну дзяцей да ролі вакалістаў-робатаў, вельмі цешыўся з выканання па-беларуску песні „Камб’ё долёр” Наталіі Арэйра. Уявіце сабе, што Оля Карпюк з Гарадка спявае гэтую песню ў касцюме пашытым на ўзор „Расспяванага Гарадка”. Не было б гэта ненатуральна? Дзеці патрабуюць паказацца пасвойму, таму былі і каляровыя кашулькі, і бліскучыя блузкі як з сапраўднай вялікай эстрады. Ёсць і такія калектывы ды творы, якія ажно просяцца, каб заспяваць гэта ў вышываным касцюме і гэта апекуны калектываў ці вакалістаў разумеюць. Музычны эксперымент у якасці песні з іспанскамоўнага серыяла напэўна некаторым можа здавацца цікавым, бо і гэта такія творчыя пошукі, але найбольшая вартасць, на маю думку, у арыгінальных песнях. З гэтым бывае аднак цяжка, таму што часта моладзь спявае песні, якія напісаны былі для дарослых, бо і рэдка пішацца кампазіцыі адмыслова школьнікам. Затое вельмі цікава слухаць найменшых выканаўцаў, якія распавядаюць гісторыі коцікаў, цёмных ночак ці зорачак. Не спяваюць пра каханне, а думаюць перад усім пра тое, як не забыць пакланіцца на канец выступлення.

Разнароднасць штораз большая. Не толькі ў касцюмах, а перад усім у песнях — шматінструментальных ды поўных складаных мелодый. Заспяваць іх — сапраўднае майстэрства. Выканаўцы, як вопытныя прафесіяналы, між сабою амаль пра свае выступы не размаўляюць, бо гэта конкурс, але „трымаюць кцюкі” і калі трэба з залы гучна падтрымліваюць сяброў. Гэта зразумела, бо без эмоцый немагчыма перажыць такога аднаго ў год конкурсу.

— Цяпер будзем чакаць чарговага конкурсу, — пасля свайго выступу кажуць гімназісты.

— Можа будзеце выступаць раней чым праз год?

— Калі нехта нас запросіць...

А сцэн з беларускай мовай — асабліва ў летнім сезоне — шмат. Варта не забываць пра арлянскіх, чыжоўскіх, бельскіх ці гарадоцкіх дзяцей. Хочуць выступаць ды захапляць, пра што не павінны забываць арганізатары фэстаў, купалляў ды іншых мерапрыемстваў.

i_basovka@o2.pl

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Выступаюць дзяўчаты з Орлі



Зося з першага „а” класа

— 33 —

Хаця Зосі было ўжо семнаццаць гадоў, яна як дзіця чакала Дня дзіцяці. Настаўнікі да першага чэрвеня вымушаны былі паставіць усе ацэнкі. Зося ўрэшце магла адпачыць ад цяжкай і доўгай навукі. Можна сказаць, што па гэтай прычыне цешыліся таксама настаўнікі. Спадарыня Ясінская, якая ад нейкага часу лунала ў аблоках, нечакана трапіла на сёмае неба. У гэтым дапамог ёй выхавацель першага „а” класа Янка Рыбачук. Мужчына, афіцыйна, на школьным калідоры, зрабіў ёй шлюбную прапанову. Ясінская ў захапленні адказала, што можа павянчацца з ім нават у сённяшні вечар. Вестка мігам абляцела II Агульнаадукацыйны ліцэй. Вучні былі пад уражаннем адвагі свайго настаўніка фізікі. Нават суровы дырэктар Баршчэўскі з адабрэннем успрыняў навіну. Дзякуючы таму ён атрымаў спецыяльнае запрашэнне на вяселле. Скарысталі і ліцэісты. Ад шчасця Янка Рыбачук павысіў сваім выхаванцам ацэнкі, дзякуючы чаму больш вучняў першага „а” класа атрымала пасведчанні з чырвонай палоскай. У агульнай эйфарыі толькі адзін Паўл Пятрушэня хадзіў маркотны. Хлапец сур’ёзна глядзеў на Рыбачука і перастаў хадзіць на ўрокі хіміі. Ніхто не разумеў яго дзіўных паводзін. У пэўны момант Паўл не сцярпеў прэсіі і выявіў сваю тайну. Папраўдзе, ён патлумачыўся толькі таму, каб сябры не мелі дурных падазрэнняў, напрыклад, што ён закаханы ў настаўніцу.

— Хаця ў нас розныя прозвішчы і іншы выгляд, — пачаў хлапец, — Ясінская... мая мама!

Гэтае прызнанне ашаламіла Зосю і Тамаша. Яны цэлы год згадвалі пра дзіўныя сустрэчы Паўла і настаўніцы, і ніколі не падумалі, што праўда такая простая. І цяпер яны добра разумелі насцярожанасць Паўла, з якой ён сустрэў вестку пра шлюб. Здаецца, мала хто хацеў бы жыць пад адным дахам з двума настаўнікамі!

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Міра ЛУКША

Сьвісьцёлы са Сьвірыд

Бамбыціля і Гарулюс,
пташкі дзьве,
пасяліліся ў Сьвірыдах
на сасьне.
Ён, яна — не распазнаць
амялушак
(у нас сьвісьцёламі завуць
гэтых птушак).
Аж па красавік зь перадзімоўя
заляціць да нас
пташкаў плойма.
І раззвоняцца, чубатыя
амялушкі,
на соснах, на рабінах
будуць гушкаць
залачоныя хвасты і пярынкі,
камароў хапаць на ляту,
арабінку,
шыпшыну, амялу, ягаднік
абяруць
амялушкі ўміг!
І каліну, і крушыну
яны любяць,
і ядловец, барбарыс
рады зьдзюбаць.
Усё дачыста амялушкі
паглытаюць!
І пасьля пастракочуць-
-пасьпяваюць,
Бамбыціля і Гарулюс,
абыдвое.
Вось якія ў Сьвірыдах
ёсьць героі!

Польска-беларуская крыжаванка № 23

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 19:

Сава, мужык, смех, перац, баск, царква, юрта, лыч. Свет, бор, выспа, месяц, мерка, муха, цыкл, тын, вы, карпач.

Узнагароды, фламастэры, выйгралі **Ася Стоцкая, Агата Грыгарук, Марыёля Анішчук, Дагмара Крупа** з Дубін, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Музыка з кайфам

„Жэмэрва”: па-свойму, па-падляшску, па-беларуску!

Зусім нядаўна завяршыўся шосты выпуск арыгінальнага фестывалю „Там по маёвуй росі”. Кожны год вясною закаханыя ў аўтэнтычны фальклор людзі і гурты з’язджаюцца ў Музей малой айчыны у падбельскіх Студзіводах. Фестываль дае новы імпульс жыццю ў ваколіцы, а ўвесь год ажыўляе яе калектыў „Жэмэрва”. Ад песні, якую ён выконвае, пайшла і назва самога фестывалю. Але „Жэмэрва” гэта больш чым толькі гаспадар фестывалю.

Не было б ні гурту, ні фестывалю, калі б не заангажаванасць Альжбеты і Дарафея Фіёнікаў. Шмат працы ўкладвае і сястра Дарафея, Аня, якая большасць свабоднага часу адводзіць калектыву. Група дзяўчат згуртавалася, каб перадаваць аўтэнтычнасць лакальных песень тым, якія пра іх ужо забылі, а нават і ніколі не ведалі. Таму, што гэта маладыя людзі, да спеваў і традыцыйных гульняў удаецца ім прыцягнуць равеснікаў, якім не заўсёды песні бабуляў здаюцца быць густоўнымі і „на часе”. Час у выпадку „Жэмэрвы” не існуе, бо мінулае вяртаюць у сучаснасць... дзеля будучыні.

Не страшная ім ніякая сцэна, выступаюць пры вогнішчах, у вясковых святліцах, у конкурсах песні ці на вялікіх эстрадах, напрыклад, у Цэнтры прамоцыі культуры Прага-Поўдзень у Варшаве, дзе іх выступленнем захапляліся часам зусім не звязаныя з беларускім фальклорам людзі. На канцэртах удзельнікі калектыву не толькі спяваюць, але і запрашаюць публіку да традыцыйных гульняў, карагодаў і танцаў. Нават калі часам нехта сароміцца танцаваць, дзяўчаты і хлопцы сваёй шчырасцю і адкрытасцю вельмі хутка заахвоцяць і пераканаюць, што варта пасмакаваць тое, што часам ведаем толькі з назвы.

„Жэмэрва” вельмі часта супрацоўнічае з мясцовымі калектывамі, вынікам чаго з’яўляюцца супольныя выступленні і лакальныя мерапрыемствы. Тады сустракаюцца жыхары вёсак, завязваюцца кантакты між пакаленнямі, кіпіць энергія. Ці не варта, каб такіх гуртоў паўстала больш?

i_basovka@o2.pl

Фота з архіва Дарафея Фіёніка

На шляху да Пана Бога

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

— Я тут быў 23 гады таму, — кажа мне Адам Кажанёўскі, дырыжор хору „Эдукатус" Педагагічнага ўніверсітэта ў Кракаве. — Нават не разумееце, што для мяне гэта абазначае.

— Разумею, што вы тады былі ў Гайнаўцы.

— Зразумела, але сам фестываль гэта проста незвычайная падзея.

Не кожны год хапае мне часу прысвяціць тры-чатыры дні апецы над хорам. Гэта час, які амаль поўнасцю трэба адвесці гэтай справе. Сёлета зусім выпадкова і сапраўды ў апошні момант аказалася, што гід хору з Кракава не можа ім заняцца. Безнадзейным голасам пані Ірэна, дырэктар Арганізацыйнага бюро фестывалю спыталася ці знайду час. Навошта траціць час на польскі хор? Ні замежнай мовы не патрэніруеш, ані не даведаешся зашмат болей пра свет, бо і горад Кракаў чалавек неаднойчы перасякаў уздоўж і ўпоперак.

Едзем у гатэль.

— Абміне нас свята супу, не паядзім сабе ў гэты раз, — гутараць між сабою харысткі.

Праўда, якраз на кракаўскім Казімежы праходзіў чарговы выпуск гэтага свежага фестывалю. Што ж, памянялі суп на віно, бо толькі з віном асацыяваўся мне фестываль царкоўнай музыкі. „Дырыжор такі сентыментальны, а харысты пра супчык — падумалася мне, — нічога, пражывем гэтыя тры дні".

Хары звычайна праслухоўваюць у Падляшскай оперы і філармоніі, але там заўсёды праблема з заламі для рэпетыцый. Прымушаны мы тады былі знайсці нейкае месца для „расспеву", бо, вяртаючыся ў гатэль, не паспявалі б на конкурс. Пачаліся гарачыя тэлефанаванні. Пасля амаль дзесяці размоў шчасліва запрашае нас да сябе гарнізонны клуб, дзе ў зялёнай сетцы, на фоне рэкламы прафесійнай арміі знялася не адна кракавянка.

Конкурс і па конкурсе. Яшчэ толькі здымак, афіцыйны, менш афіцыйны, дырыжор сярод дзяўчат, сам дырыжор, цэлая фотасесія.

— Заўсёды магло б быць лепш, але на гэты момант праспявалі ўсё, што змаглі, — кажа Адам, дырыжор і вялікі сябра сваіх „пеўчых". — Сёння будзем ужо толькі адпачываць пасля дарогі і эмоцый.

Наступнага дня збіраемся ў Белавежу, дзе ў касцёле, разам з іншымі харамі, будзем спяваць канцэрт. Яшчэ пры абедзе хлопцы хваляцца, што Беласток ведаюць ужо даволі добра.

— Учора на „Ювеналіі" мы паехалі зайцам, бо ў вас немагчыма набыць білет у аўтобусе.

Не буду саромецца за наш гарадскі транспарт.

— І нам часам здараецца, — адказваю з хітрай усмешкай.

— Чаго ўчора не было! „Хлоп з мазур", „Нех жые вольносць", „Естэсь шалёна"! Класіка дыска-пола, — захапляюцца канцэртам. — Можа і не слухаем дыска-пола, але гульня — клас! І мора людзей.

— А як адчуваеце сябе перад чарговым, духоўным канцэртам?

— Крыху гучаць у галаве гэтыя дэцыбелы, але сёння ўжо рыхтаваліся, за намі рэпетыцыя. Чакаем пушчы.

Так і направіліся ў пушчу.

— Давайце даглядзім фільм! — хтось заклікнуў.

— Едучы сюды, аглядалі „У Пана Бога за печкай" ды „У Пана Бога ў агародзе", — пачалі тлумачыць. — Проста хацелі адчуваць сябе па-падляшску.

А мне на смех збіралася. Але такі сардэчны, барані Бог не іранічны. Шчырасць і дабрадушнасць харыстаў захапіла мяне. Супольна даглядзелі другую частку фільма, калі нечакана ўехалі ў Гайнаўку.

— Ілона, ці мы можам пабачыць гайнаўскі сабор? — сур'ёзна спытаў Адам, а за ім просьбу паўтарылі студэнты.

— Можам, але скажу шчыра, не гарантую ці ўвойдзем усярэдзіну.

Чаму існуюць два фестывалі я патлумачыла раней, але пабаялася, што сапраўды не ўвойдзем у царкву. Калісь мне ўжо гэта здарылася. На стаянцы толькі што затрымаўся малдаўскі хор.

— Давайце хуценька, можа калі ім дазволяць наведаць царкву, то і нам удасца, — кажу, хаця адчуваю сябе неяк паранаічна.

Удалося. Але перад ад'ездам падышоў да мяне апякун малдаванак.

— Ку...а, як гэта магчыма. Заходжу на сваю парафію, а мне дыякан кажа, што не магу зайсці з хорам. А гэта ж праваслаўныя дзяўчаты, хочуць пабачыць, памаліцца за шчаслівую дарогу. Колькі яшчэ будуць з нас дурняў рабіць. Хто яны такія. На канец сказаў мне: „Заходзьце, але я вас не бачыў". Ну, нічога. Бацюшка з парафіі св. Іаана Хрысціцеля нас запрасіў. Там заспяваем.

Было мне прыкра і сорамна, зразумела, не за сябе, а за сваю грамаду, перад гасцямі, якія ўсю Польшчу пераехалі, каб пабачыць гэтае месца.

— Помню, як атрымліваў я тут узнагароду ў 1986 годзе... — сказаў задумліва Адам.

Паехалі ўрэшце да зуброў. Хаця наш зубрыны запаведнік невялічкі, то большасць спевакоў захаплялася ўсім, што пабачыла.

— У нас у горах водзяцца ваўкі, але ніхто іх не бачыць. Так хаваюцца, — расказвае адзін з харыстаў, які працаваў у нацыянальным парку ў Татрах.

Сфатаграфаваліся з зубрамі, запісалі басістыя спевы каралёў пушчы і падаліся ў Белавежу, дзе прадбачаны быў вячорны канцэрт. Усе хары вельмі цёпла былі прыняты мясцовай (і не толькі) публікай. Адчувалася сапраўднае захапленне. Асабліва кракаўскі хор, які завяршыў канцэрт некалькімі творамі на латыні ды „Гаўдэ матэр", напэўна вельмі спадабаўся каталіцкай частцы публікі, бо спалучаў у гэты раз розныя традыцыі. Пасля супольная вячэра.

Дзяўчаты з хору непасрэдна пасля свайго конкурснага выступу

Хары з Кракава і Южнаўкраінска рэпетуюць „Многая лета"

— У нас такое пытанне... — нясмела кажуць, гледзячы адзін на аднаго, два харысты. Ці ёсць шанс праехаць праз Каралёвы Мост?

— Па-першае, гэта не па дарозе, а па-другое, у Каралёвым Мосце фільмы Яцка Бромскага амаль не здымаліся. У фільме „У Пана Бога за печкай" ёсць можа пару сцэн знятых на шашы, ёсць і дарожны ўказальнік, у другой частцы таксама, але большасць сюжэтаў здымалі ў Супраслі і Саколцы.

— Мы разумеем, але хаця б каб каля ўказальніка праехаць...

— Але будзе ўжо цёмна...

— Нічога!

— Калі вельмі хочаце....

— Ура! — сапраўды шчырая радасць разлілася па аўтобусе.

— Дык павяду вас зусім іншым маршрутам.

Такім чынам паехалі мы ў гміну Нараўка. Перасякаем чарговыя чыгуначныя пуці. Расказваю пра чыгунку ў пушчы, калі да мікрафона падыходзіць нехта ззаду.

— Раскажу вам, чаму рускі пуць шырэйшы. Прыходзяць майстры да цара....

Праз момант увесь аўтобус заходзіцца ад смеху. І нічога, што падаюць нецэнзурныя словы, цяжкія жарты ды чуюцца задзірлівыя галасы. Дырыжор, хаця гэта свайго роду настаўнік, разумее маладых як мала хто. Няма жорсткай дысцыпліны, якую ведаю з іншых студэнцкіх хароў, ёсць сімпатыя, цяпло, добрая камунікацыя. Ззаду бяжыць ужо чарговая дзяўчына.

— То я раскажу, чаму вымерлі туры...

Пераязджаем са смехам каля лясного вадапою ў Лядскай пушчы.

— Можа і мы пабачым зараз рысь ці аленя на свабодзе? — пытаюць рытарычна хлопцы.

— А гэтая ляўкоўская царква была калісь, як многія іншыя на гэтай тэрыторыі, уніяцкай.

— У нас таксама шмат грэка-каталікоў, — дадае нехта з сярэдзіны. — А як вернемся ў Беласток, то заўтра зраніцы можам пайсці ў царкву, пабачыць нядзельную службу? — пытаюцца дзяўчаты. — Бо нам нехта казаў у Кракаве, што ў царкве не вельмі задаволеныя, калі хтось чужы прыходзіць.

Мне, зразумела, падалося гэта дзіўным, тым больш ахвотна патлумачыла я дарогу ў бліжэйшую царкву.

Па дарозе ўсе захапляліся цудоўнымі ілюмінацыямі нашых цэркваў.

— А зараз уязджаем у свежы горад, Міхалова. У вас ладзяць свята супу, а ў Міхалове — свята грыба.

Усе выбухнулі смехам. Каментарыям не было канца.

— А зараз пераязджаем у гміну Гарадок. Ужо бачыце купалы царквы, — расказваю пра гарадоцкія адметнасці да моманту, калі хтось не заўважыў, што ў гэтай гміне распаложаны Каралёвы Мост. — Як вы добра зарыентаваны, — смяюся.

Тады Шыман паказвае ўсе кніжкі пра Падляшша, якія ўзяў з сабою. Пра Падляшша, пра Белавежскую пушчу. Здабыў нават карту Беластока... з 1990-х гадоў. Усе мясцовасці адшукоўвалі на картах, пыталі пра праваслаўныя традыцыі, пра беларускія абрады, ведалі нават, што варта падацца ў байдарачны паход па рацэ Нараўцы. Толькі марыць пра такіх турыстаў. А яны ж прыехалі толькі спяваць. Сэрца мне радавалася, калі вялі такую сардэчную гутарку пра наш рэгіён, што хацелі ведаць больш і больш.

Засталася толькі нядзеля. Хор узяў другое месца

— Гэта вельмі важная ўзнагарода, — сказаў Адам Кажанёўскі. — Мы ж не ўмеем так маліцца як праваслаўныя.

Апрача „Херувімскай" у час галаканцэрта двойчы выступілі перад беластоцкай публікай. Адкрылі момант абвяшчэння вынікаў ды ўрачысты канцэрт лаўрэатаў песняй „Гаўдэ матэр", супольна з мінскімі студэнтамі, якія, паводле традыцыі, праспявалі „Сціхіру святым". Прыйшоў час развітацца. Не люблю такіх момантаў, бо чалавек звычайна прывязваецца, асабліва, калі сустракае так адкрытых маладых людзей. Такім чынам у мяне з'явіліся новыя сябры, а яны ведаюць, што Падляшша гэта рэгіён, які чакае адкрывальнікаў. А ўсё дзякуючы царкоўным спевам. Добрых людзей можна вымаліць песняй.

Калі цвітуць каштаны

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Адзін з маіх настаўнікаў у сярэдняй школе маўляў, што калі зацвітуць каштаны, вучні пачынаюць слаба працаваць і таму да гэтага часу стараўся зрэалізаваць асноўную частку праграмы і паставіць такую колькасць ацэнак, каб пасля магчы паставіць завяршальную. Мінула з таго часу больш дваццаці гадоў, але настаўнікі сярэдніх школ надалей павінны браць прыклад з даўняга гайнаўскага педагога якраз з-за характару і часу правядзення матуральных экзаменаў. У меншай або большай ступені яны абмяжоўваюць магчымасць звычайнай працы настаўнікаў з малодшай моладдзю, а ў некаторых выпадках на кароткі час нават дэзарганізуюць рэалізацыю школьнай праграмы. Модными ў час матуральных экзаменаў сталі экскурсіі для рэшты вучняў.

Агнешка Оўцаж (злева) і Іаанна Сэрэмак лічаць, што сёлетнія матуральныя экзамены па беларускай мове не былі цяжкімі

Выпускнікі нашых белліцэяў мусілі вельмі інтэнсіўна працаваць як да часу, калі зацвілі каштаны, так і ў часе, калі яны цвілі. За малымі выключэннямі амаль усе выпускнікі Бельскага і Гайнаўскага белліцэяў рашыліся паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе найчасцей набор праводзіцца на падставе вынікаў матуральных экзаменаў і поспехаў на прадметных алімпіядах. Ужо загадзя белліцэісты спраўджалі патрабаванні на спецыяльнасцях, дзе маюць намер працягваць вучобу і пад іх падбіралі дадатковыя пісьмовыя матуральныя экзамены. Хаця ў Бельскім і Гайнаўскім белліцэях пісьмовыя экзамены па беларускай мове і прэзентацыі па гэтым прадмеце абавязковыя, у гэтым годзе мнагавата вучняў да іх не прыступіла, бо з'яўляюцца яны фіналістамі або лаўрэатамі Алімпіяды беларускай мовы. У Гайнаўцы на 107 выпускнікоў, ажно 15 асоб гэта алімпійскія пераможцы і атрымалі яны максімальную колькасць балаў на матуральным экзамене па беларускай мове. У Бельскім белліцэі на 126 выпускнікоў таксама каля 10 асоб было звольненых з экзамену па беларускай мове і завяршылі яны матуральныя змаганні з самай вялікай колькасцю балаў па роднай мове. Аднак мала белліцэістаў як у Гайнаўцы, так і ў Бельску схацела здаваць пісьмовы матуральны экзамен па беларускай мове ў пашыранай формуле. Магчыма, што на такі крок рашыліся ў асноўным тыя асобы, якія хочуць выкарыстаць вынікі экзамену па беларускай мове ў якасці вынікаў па замежнай мове, бо так у час рэкрутацыі можна зрабіць у некаторых вышэйшых установах.

— Нават адна беластоцкая выпускніца была прыдзелена да нашай школы здаваць матуральны экзамен па беларускай мове, але яна, як пераможца Алімпіяды беларускай мовы, была звольнена з гэтага экзамену і атрымала максімальную колькасць балаў, — інфармуе дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк.

Па-першае, праверка ўмеласцей

Сёлета ў час пісьмовага матуральнага экзамену па беларускай мове, што праходзіў 20 мая, у падставовай формуле трэба было вучням на падставе публіцыстычнага тэксту адказаць на адкрытыя і закрытыя пытанні, якія тычыліся Аўгустоўскага канала.

— Тэкст быў зразумелым і няцяжкім для аналізу. Трэба было адказаць на 13 пытанняў пра Аўгустоўскі канал, які ў мінулым спалучаў польскую, беларускую і літоўскую тэрыторыі, — заяўляе гайнаўская белліцэістка Агнешка Оўцаж.

Творчыя працы, абмежаваныя па аб'ёме, трэба было напісаць на адну з дзвюх выбраных тэм, падмацаваных фрагментам прозы і вершамі.

— У сваёй творчай пісьмовай рабоце я спаслалася на філасофскую тэму прамінання жыцця, маючы на ўвазе верш Віктара Шведа „П(е)рамінанне" і фрагмент прозы Сакрата Яновіча „Гасцінец". Гэтая тэма паказалася мне цікавай, паколькі я магла шырэй выказаць свае развагі аб жыцці. У сваёй рабоце звярнула ўвагу на хуткацечнасць жыцця, у якім чалавек можа па сабе пакінуць нешта станоўчае. Аднак трэба спяшацца рабіць дабро, бо штораз цяжэй жыць людзям, калі яны старэюць, — гаворыць белліцэістка Агнешка Оўцаж.

— Я пісала на іншую тэму, спасылаючыся на верш аб родным доме. Лічу, што калі мы нават выедзем далёка, не павінны забываць свой дом і родныя нам месцы, — кажа гайнаўская белліцэістка Іаанна Сэрэмак.

Выпускнікам, а тым болей малодшым вучням, невядомыя даўнія матуральныя экзамены і цяжка ім зрабіць нейкія параўнанні з цяперашнімі матуральнымі патрабаваннямі, якія былі да рэформы школьніцтва. Настаўнікі беларускай мовы станоўча ацэньваюць новыя матуральныя экзамены па роднай мове, але адначасна звяртаюць увагу, што яны павінны быць умела падрыхтаваныя з улікам магчымасцей і ведаў вучняў.

— Пасля пробных матуральных экзаменаў па беларускай мове я звярнуўся ў Цэнтральную экзаменацыйную камісію з фармальнымі засцярогамі і яны былі прыняты да разгляду. Напрыклад, у час зімовага экзамену было пытанне да публіцыстычнага тэксту з фармуліроўкай „якія прычыны?", а ў час праверкі матуральных работ трэба было ставіць адзін бал за 2 прычыны і 2 балы за 3 прычыны. У задачах павінна быць фармулёўка, каб знайсці 3 прычыны, як было на пробным матуральным экзамене па польскай мове. На экзамене па беларускай мове вучні знаходзілі 2 прычыны і думалі, што гэтага дастаткова, — расказвае настаўнік беларускай мовы з Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі. — Літаратурна-крытычны тэкст на падставовым пробным матуральным экзамене па беларускай мове быў складаным для вучняў і з такой ступенню цяжкасці павінен быць запрапанаваны на пашыраным экзамене.

Дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк у агульным крытычна ставіцца да патрабаванняў „ключоў", паводле якіх правяраюцца пісьмовыя экзамены па беларускай і польскай мовах, якія абмяжоўваюць вучняў у іх творчай інтэрпрэтацыі тэкстаў. Аднак лічыць ён, што патрэбны абавязковыя пісьмовыя матуральныя экзамены па беларускай мове, якія праводзяцца ў нашых белліцэях, бо яны падводзяць вынікі трохгадовай працы з вучнямі. Бельскі дырэктар мяркуе, што калі б не былі яны абавязковымі, прыступіла б да іх толькі невялікая колькасць выпускнікоў. Я думаю, што так было б таксама з польскай мовай у выпадку вучняў, якім вынікі па гэтым прадмеце непатрэбныя ў час рэкрутацыі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Калі нашы міністэрскія ўлады рашыліся ўвесці абавязковы матуральны экзамен па матэматыцы, гэта выклікала незадавальненне сярод вялікай колькасці вучняў сярэдніх школ, якім гэты прадмет недаспадобы, а сваю будучыню злучаюць з адукацыяй на гуманітарных спецыяльнасцях.

— З перспектывы апошніх гадоў відаць, што пісьмовыя матуральныя экзамены па беларускай мове, праводжаныя паводле новых прынцыпаў, лепш правяраюць умеласці і веды вучняў. Праверка матуральных прац адбываецца ананімна, больш аб'ектыўная, чым раней. Няма ўжо таксама выпадкаў, што вучні прыходзяць на экзамены з гатовымі работамі з надзеяй, што здолеюць іх перарабіць пад нейкую прапанаваную тэму. Зараз на матуральным экзамене па беларускай мове няма многа часу і вучні вымушаны ў агульным працаваць самастойна і спяшацца, каб справіцца з усімі патрабаваннямі, — гаворыць гайнаўскі настаўнік Ян Карчэўскі. У гэтым годзе толькі некалькі пытанняў было закрытых, калі вучні мелі магчымасць кансультавацца паміж сабой які выбраць адказ (напрыклад „а", „б", ці „в"). Аднак патрабаванні па беларускай мове былі так сканструяванымі, што ў першую чаргу правяралі ўмеласці вучняў.

Ці патрэбныя прэзентацыі?

Ужо некалькі гадоў вядзецца дыскусія наконт прыдатнасці прэзентацый па польскай мове. Гаворыцца, што некаторыя выпускнікі заказвалі падрыхтоўку прэзентацый у іншых асоб або спампоўвалі гатовыя матэрыялы з інтэрнэту. Можа некаторым вучням шкада было траціць час на іх самастойную апрацоўку, паколькі трэба было рыхтавацца да пісьмовых экзаменаў. У выпадку прэзентацый па беларускай мове не чуў я што вучні не рыхтавалі іх самастойна. У гэтым годзе прэзентацыі былі ацэнены высока, як у Бельскім, так і ў Гайнаўскім белліцэях.

— Калі гаварыць пра прэзентацыі па беларускай мове, я ведаю, што ёсць розныя погляды наконт патрэбы іх правядзення, але я асабіста лічу іх патрэбнымі. Даюць яны магчымасць паказаць вучням умеласці, якіх нельга праверыць у час пісьмовых экзаменаў і дазваляюць папрацаваць з матэрыяламі па беларускай літаратуры, гісторыі, ці наконт нашых традыцый або культуры, залежна ад тэм, якія зацікавілі вучняў. Адна з маіх вучаніц схацела падрыхтаваць прэзентацыю тэкстаў беларускай рок-музыкі і яе прапанова была прынята (аднак прэзентацыя не магла адбывацца перад настаўнікам, які вучыў беларускай мове — А. М.). Мела яна магчымасць працаваць з тым, што яе цікавіць, — кажа настаўнік Ян Карчэўскі. — У час прэзентацый вучні паказвалі кароценькія фільмы, пускалі запісаныя размовы і карысталіся мультымедыйнай тэхнікай, што рабіла іх выступы больш займальнымі.

Калі вучні не прадставілі сваіх прапаноў восенню, тэмы прэзентацый мусілі выбіраць з прапаноў, якія падрыхтавалі ім настаўнікі беларускай мовы. Я думаю, што калі прыйдзе рашэнне аб ліквідацыі прэзентацый па роднай для палякаў польскай мове, то нашы белліцэісты перастануць таксама рыхтаваць іх па беларускай мове. Якраз мае сёлетнія суразмоўцы да прэзентацый па беларускай мове ставіліся станоўча.

— У час прэзентацыі я расказала пра старажытныя беларускія гарады — Полацк, Навагрудак і Мінск. Лічу, што і зараз варта наведаць гэтыя гарады, каб пазнаёміцца з іх гісторыяй і сучаснасцю, — гаворыць Агнешка Оўцаж.

Яе сяброўка Іаанна Сэрэмак гаварыла пра партрэт жанчыны-маці ў паэзіі Максіма Танка і Алеся Барскага.

У гэтым годзе выпускнікі нашых белліцэяў хочуць спалучыць сваю будучыню з такімі спецыяльнасцямі на вышэйшых установах, якія дадуць ім магчымасць знайсці работу.

Газета павярнула круг

Міхал МІНЦЭВІЧ

Нядаўна трапіла ў мае рукі газета „Русское Слово” ад 27 мая 1906 года, якая выходзіла ў Маскве. Газета мае шэсць вялікіх — удвая большых за ніўскія — старонак. Ёсць там адрасная паметка: „Г. Учит. Е. Сычу, Щитовское народное учил”. Гэтую 103-гадовую газету паказаў мне спадар Дарыюш Гарадэцкі, дырэктар комплексу школ у Орлі, а я паспрабаваў прасачыць яе гісторыю.

Газета з пачатку мінулага стагоддзя захавалася ў сям’і Лявона Кубаеўскага з Орлі. Нядаўна ягоны сын Анатоль, які пасля выхаду на пенсію вярнуўся ў Орлю, перадаў газету ў мясцовую школу. Раней, як я неафіцыйна даведаўся, хацеў ён гэтай газетай зацікавіць некаторых жыхароў Шчытоў, але беспаспяхова. Затое дырэктар Гарадэцкі рупліва цікавіцца ўсім, што звязанае з мінулым рэгіёна. Мясцовыя жыхары ведаюць пра гэта і калі хочуць зберагчы некаторыя здабыткі мінуўшчыны, перадаюць іх у школу. Вось і спадар Анатоль Кубаеўскі раней перадаў у школу даволі цікавыя прадметы: кафлю з пячаткай уласніка кафлярні Вайштына, некаторыя прылады для ручнога вырабу кафлі, вайсковую біклагу і звяно танкавай гусеніцы.

У перыяд уніяцтва прыхадскіх школ у наваколлі Орлі ў прынцыпе не было. Нягледзячы на рэкамендацыі іерархаў, большасць духавенства не мела ахвоты або і патрэбных для гэтай дзейнасці ведаў. Карэнная змена наступіла з адменай прыгону.

У сакавіку 1863 года ў беларускіх і літоўскіх губернях быў уведзены закон аб народных школах. Малыя прыхадскія школкі спынілі існаванне, а большыя былі пераведзены пад дзяржаўнае падпарадкаванне. У 1864 годзе атрымалі яны ўзбуйненае дафінансаванне з боку асветнага міністэрства.

У такіх школах вучыў адзін настаўнік ды катэхет — настаяцель прыхода. Настаўнік вучыў пісання, чытання, арыфметыкі і царкоўнага спеву. Настаяцель вучыў царкоўнай гісторыі і катэхізісу.

Газета, якая звыш ста гадоў захавалася ў жыхара Орлі, дазваляе заглянуць у нашу мясцовую гісторыю. Менавіта, выклікае ў нас пытанне: кім быў яе падпісчык?

Вось адна са згаданых школ паўстала таксама ў Шчытах. За яе заснаванне хадайнічаў м.інш. тадышні настаяцель Шчытоўскага прыхода Ануфры Гагалеўскі. Невядома, хто быў у ёй першым настаўнікам, аднак вядома, што ў 1873 годзе вучыў тут Іван Сяняеў, а пасля Канстанцін Скаркоўскі. У 1884 годзе ў шчытоўскім народным вучылішчы вучылася пяцьдзесят пяць хлопцаў і пяць дзяўчынак. Чарговай настаўніцай была Марыя Скабалановіч (дачка чыжоўскага бацюшкі), а пасля, у 1890-1897 гадах вучыў тут Якуб Дарашкевіч (фельдфебель 62-га Суздальскага палка з Бельскага гарнізона). Чарговыя тры гады ў шчытоўскай школе працавалі Юзаф Кацэвіч і Любоў Прыклонская, а з 1900 года вучыў Пётр Малішэўскі, якога змяніў Емяльян Сыч — падпісчык згаданай газеты, які працаваў тут найдаўжэй, бо аж да 1914 года, калі быў змабілізаваны ў армію. Трэба таксама адзначыць, што быў ён актывістам арганізацыі ўзаемадапамогі, якая дзейнічала ў Шчытах. Не дзіва, што такі чалавек шырэй цікавіўся рознымі навінамі, якія прыносіла маскоўская газета.

Вярнуся да колішняй школы. Выбух першай сусветнай вайны спыніў дзейнасць такіх вучылішч. У 1915 годзе ў народнай школе ў Шчытах вучылася яшчэ 52 вучняў, але ранняй восенню большасць тых дзяцей разам з сем’ямі падалася ў бежанства ўглыб Расіі. Паводле захаваных прыхадскіх дакументаў школьную маёмасць пераняў а. Мікалай Стракоўскі.

Што далей з газетай? Як сказаў дырэктар Дарыюш Гарадэцкі, захаваная газета (разам з гэтым ніўскім артыкулам) будзе паказана ў вітрынцы пры нагодзе чарговай школьнай выстаўкі. Гэта не толькі ўспамін школьнай гісторыі, але і сведчанне пашаны для яе. Газета павярнула круг ад народнай школы да сённяшняй.

ПраўдзіСвет

Віртульная прастора ўсё больш уцягвае ў сябе новыя і новыя бакі рэальнага жыцця. Вось і напрыканцы мая гучна заявілі аб сваёй інтэрнэт-справе беларускія перакладчыкі. У Байнэце з’явіўся сайт, прысвечаны перакладам на беларускую мову літаратурных твораў іншамоўных аўтараў.

Назва сайта, які месціцца па адрасе **www.prajdzisvet.org**, адразу выклікае зацікаўленне — інтэрнэт-часопіс „ПраўдзіСвет”. Напачатку яна падаецца не зусім сур’ёзнай для такой адказнай справы, як перакладчыцкая дзейнасць, але потым згаджаешся з аўтарамі сайта, што гэта даволі трапнае азначэнне сутнасці многіх перакладаў.

„Ці можна знайсці большага ПраўдзіСвета, чымся перакладчык, большага пройды і блудзягі, палусвета і авантурніка? Ён ходзіць-бадзяецца з торбаю па свеце, усё шукае нечага, імкнецца зразумець, а тады, як у родную мясціну завітае, то апавядае, што бачыў, што чуў, — выказваюцца ідэйныя натхняльнікі сайта на першай старонцы інтэрнэт-часопіса. — Ці ёсць большы ПраўдзіСвет, чымся перакладчык? Большы махляр і круцель, крутасвет і штукар? Ён, як праўдзівы майстар-ашуканец, падмяняе чужое сваім, а сам хаваецца ў цень. Але мы любім гэтыя махлярствы і марым, што наступным разам ён так нас надурыць, што мы й не прыкмецім падма(е)ну”.

Адыходзячы ад іранічна-добразычлівага погляду на перакладчыцкую справу, аўтары сайта распавядаюць непасрэдна пра змест першага і наступных нумароў свайго інтэрнэт-часопіса. Падаецца апісанне ўсіх рубрык сайта, якіх, дарэчы, вельмі многа. Найбольш цікавыя з іх, дзеля чаго і існуе „Праўдзісвет”, месцяцца на старонцы „Тэкст”. Яна — па жанрах літаратурнага мастацтва — падзяляецца на „Прозу”, „Паэзію” і „Драму”.

Далей ідуць так званыя калялітаратурныя старонкі. Аўтары сайта даводзяць даволі цікавую інфармацыю ў рубрыцы „Кантэкст” пра намінантаў Пулітцэраўскай прэміі 2008 года. Распавядаюць пра біяграфічныя і творчыя шляхі англійскай літаратаркі Анджэлы Картэр, падаюць інтэрв’ю з Чарлзам Букоўскім і Сяргіем Жаданам.

Рубрыка „Майстар” не зусім напоўненая інфармацыяй. Пакуль майстрам, згодна яе, ёсць толькі Васіль Сёмуха, які дае віртуальны майстар-клас. На старонцы прадугледжана падрубрыка „Семінар”, але пакуль там нічога няма.

Выдатнай знаходкай для зацікаўленых у веданні ўкраінскай мовы ёсць тэставанка з яе, што месціцца на старонцы „Гульня”. Выбіраючы адказы-пераклады на пытанні з нekaлькіх прапанаваных, чытач спраўджвае свой узровень ведаў па мове Тараса Шаўчэнкі.

Імёны тых, чыя праца нейкім чынам адлюстроўваецца на старонках „ПраўдзіСвета” не застануцца забытымі. У рубрыцы „Асоба” мы знойдзем біяграфічныя звесткі пра аўтараў, крытыкаў, мастакоў і перакладчыкаў. Такі падыход да людзей, што працуюць на перакладчыцкай глебе, указвае на сур’ёзнасць інтэрнэт-выдання. Больш таго, ён — важкі доказ прафесійнай прыгоднасці для пачынаючых перакладчыкаў.

Рубрыка з дзіўнай назвай „Цені” змяшчае інфармацыю пра мэты і задачы „ПраўдзіСвета”. Таксама тут падаецца пералік моў, з якіх ужо ёсць ці яшчэ будуць пераклады.

Варта адзначыць, што даны праект з’явіўся пры падтрымцы грамадска-культурніцкай кампаніі „Будзьма”, аб сайце якой пісала „Ніва” ад 19 кастрычніка мінулага года.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

„Калектыўны” травень

Вось і мінуў апошні веснавы месяц гэтага года. Для беларускага спорту ён быў адзначаны больш калектыўнымі, чым індывідуальнымі дасягненнямі. Таму ў традыцыйным ніўскім падсумаванні вынікаў аддаём прыярытэт лепшым камандам месяца. Камандавых заваёў у траўні сапраўды было нямала.

1. Моладзевая мужчынская зборная Беларусі па валейболе ўпершыню ў гісторыі заваявала права гуляць у фінальнай стадыі чэмпіянату планеты. Падрабязна пра гэта расказвалася ў мінулым нумары.

2. Зборная нашых шаблістаў на этапе Кубка свету ў італьянскай Падуі (горад, дзе працаваў вялікі Францішак Скарына) заваявала залатыя ўзнагароды. У фінале нашы фехтавальнікі перамаглі французскіх мушкецёраў — 45:41.

3. Галоўная хакейная каманда краіны, выйшаўшы ў чвэрцьфінал, паспяхова выступіла на першынстве свету ў Швейцарыі.

4. Каманда Беларусі па веславанні на байдарках і каноэ на этапе кубка свету ў Познані здабыла ажно 6 медалёў і заняла другое агульнае месца пасля Нямеччыны сярод усіх краін.

5. Валейбольная жаночая дружына паспяхова прайшла другі этап кваліфікацыі да чэмпіянату свету. Застаўся яшчэ адзін (і вельмі цяжкі) крок.

Вартыя кароткай згадкі і асаблівай адзнакі таксама гандбольная жаночая каманда БНТУ-БелАЗ, мужчынскі баскетбольны „Мінск-2006”, якія сталі чэмпіёнамі Беларусі, а таксама футбольны наваполацкі „Нафтан”, які ўпершыню стаў уладальнікам кубка краіны.

Далей пяройдзем да звыклага, але ўрэзанага варыянта прадстаўлення лепшых спартоўцаў месяца паводле індывідуальных заслуг.

1. **Канстанцін Сіўцоў** (веласпорт) другім у гісторыі сярод беларусаў (пасля Васіля Кірыенкі) выйграў асобны этап прэстыжнай шматдзённай гонкі „Джыра д’Італія”. Акрамя гэтага наш прадстаўнік амерыканскай каманды „Каламбія” ў генеральнай класіфікацыі трапіў у дваццатку мацнейшых (16-е месца), што сведчыць пра яго высокі клас.

2. **Андрэй Мезін** і **Міхаіл Грабоўскі** (хакей). У камандавым ансамблі зборнай роля гэтых двух асоб была найважнейшай. Грабоўскі сярод нашых стаў лепшым бамбардырам, а Мезін увогуле прызнаны лепшым галкіперам форуму.

3. **Юры Даўгаполаў** (кулявая стральба) у нямецкім Мюнхене на чарговым этапе Кубка свету выйграў бронзавы медаль у практыкаванні з пнеўматычнага пісталета з адлегласці 10 метраў.

1. **Наталля Міхневіч** (штурханне ядра) выйграла тры сярэбраныя ўзнагароды на міжнародных турнірах серыі Гран-пры ў розных гарадах Паўднёвай Амерыкі.

2. **Вікторыя Азаранка** (тэніс) на адкрытым чэмпіянаце Францыі — турніры „Ралан Гарос” — спярша выйшла ў чацвёрты круг турніру, абыграўшы ў дадатковы дзень у трэцім вырашальным сеце іспанку Карлу Суарэс-Навара. А потым у адной восьмай фіналу сустрэлася з сербкай Анай Іванавіч і ўпэўнена перамагла яе ў двух сетах — 6:2 і 6:3. У матчы за выхад у паўфінал Азаранка трапіла на першую ракетку свету расейку Дынару Сафіну. На момант гэтага аналізу Вікторыя працягвала таксама выступ у парнай намінацыі.

3. **Меліта Станюта** (мастацкая гімнастыка) на чарговым этапе кубка свету, што прайшоў у іспанскай Марбеллі заняла 4-е месца ў шматбор’і. У асобным практыкаванні са скакалкай Станюта выйграла бронзавы медаль.

Па каляндарным раскладзе чэрвень мусіць быць больш зацішным. Але хто ведае...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Невуцтва, невуцтва і яшчэ раз невуцтва!

Жыхары Гайнаўшчыны ўзбударажаны трагічнай смерцю маладога святара а. Тамаша Леўчука. Ягоная смерць — як кожная іншая — напамін аб крохкасці нашых зямных планаў і ўсяго, да чаго ў гэтым жыцці ставімся як да нечага трывалага. Але гэтая смерць з’яўляецца таксама вялікім папярэджаннем і навукай, пасланымі нам Богам, каб не ігнараваць Ягоных слоў. Прывыклі мы да прысутнасці ў нашым атачэнні ўсялякіх варожак, цудатворцаў і знахарак. Многія з нас ідуць да іх за парадай ці дапамогай у хваробе, а потым з асалодай расказваюць як гэта „малітвы” бабкі з ... (тут уставіць назву вёскі, у якой „лечымся”) дапамаглі нам або нашым блізкім. Гэтым разам асабліва ярка відаць, якімі гэта моцамі карыстаюцца шаптухі. Бо толькі д’ябал мог загадаць адной подлай бабе паслаць другую дурную бабу ноччу на ростані і паставіць там перашкоду для праязджаючых па гэтай шашы. І так кіраваць ейнымі крокамі, каб першым на гэтую перашкоду наехаў праваслаўны святар. І што з таго, што пракурор дабярэцца да абедзвюх дурных баб — і той з Істока, і той з Ягаднік: малады чалавек не жыве, двое дзяцей страцілі бацьку, матушка — свайго духоўнага мужа, а вернікі — пастыра. А мы далей у Валечках, Гандзях і іншых бабішчах будзем бачыць „божых памочніц”? І нават гэтая непатрэбная смерць не навучыць нас розуму?

І яшчэ адно: у Евангеллі апісана, як гэта яўрэйскія святары не прынялі грошай ад Іуды, бо на іх была кроў. Грошы ад шаптух таксама заплямлены крывёю! Ці надалей гэта не будзе перашкаджаць нашым бацюшкам прымаць розныя пабожныя ахвяраванні ад чараўніц?

Марк ЦЫБАРТ

Вольнаму воля

Маладзец і добры знаток Свяшчэннага Пісання Марк Цыбарт, што напісаў адгалоску на рэпартаж Міры Лукшы пра пабыўку шаптухі Ганны ў дабрывадскай царкве і прадказанне стварэння там за чатыры-пяць гадоў манастыра. Міру Лукшу я шаную і чытаю ейныя ніўскія артыкулы і рэпартажы, хаця некаторыя з іх складаныя, аднак цікавыя і вартыя рэфлексій і ацэнак. Марк Цыбарт у сваёй адгалосцы слушна асудзіў дзеянні розных шаптуноў і чарадзеяў, якія займаюцца варажбой, спірытызмам ці магічнымі лекавымі працэдурамі..., Гэта ўсё работа злых духаў і д’ябал, каб адвесці чалавека ад жывога Бога „падлечыць” яго, абы толькі верна яму служыў. І гэта ўсё спрадвечныя „навука” і „лячэнне” розных чарадзеяў і шаптуноў.

Хіба ніхто лепш не ведае Ганны за мяне, бо я за свае трыццаць сем гадоў працы лістаношам вельмі часта сустракаўся з ёю, гутарыў і заўсёды крытычна адносіўся да ейнага „лячэння” і асцерагаў, каб яна назаўсёды спыніла такія дзеянні. Бо яе бацька Кандрат, пра якога і я шмат пісаў у „Ніве”, быў іншы і чарадзеяў ён не цярпеў. Ён добра ведаў Біблію і сам быў добрым чалавекам. І Ганна ўнаследавала па бацьку дабрыню і добразычлівасць, яна ўжо старэнькая, ёй хіба ўжо восемдзесят чатыры гады.

Міра Лукша на ўсю старонку расхваліла Ганну амаль як святую ўгодніцу, якую варта распісаць на іконе і павесіць у царкве; жартую, не падумайце сур’ёзна. Хаця недзе ў Расіі нехта намаляў Сталіна і святую Матрону побач яго, а бацюшка згадзіўся павесіць абраз у царкве, каб прыхаджане да іх маліліся. Але прыхаджане партрэт Сталіна і Матроны выдварылі і бацюшка пакінуў прыход; гэтая падзея была паказана ў расійскім тэлебачанні.

Марк Цыбарт рэпартаж Міры Лукшы называе „цікавым падыходам да тэмы, якая датычыць многіх чытачоў”. І дадае, што не можа згадзіцца з ацэнкай Ганны, як „шчырай хрысціянкі, вядомай з блаславёнай Госпадам дзейнасці лекавання...” А я, Панфілюк, не магу згадзіцца, каб у „Ніве” паяўляліся падобныя рэпартажы аб розных шаптунах і чарадзеях з расхвальваннем іх да неба, бо гэта ім гонар і найлепшая рэклама. А калі ўжо пра іх пісаць, дык пісаць праўду, што яны на службе выключна цёмных сіл.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Веснавыя занатоўкі

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

Хоць здароўе ў мяне яшчэ нестабільнае (праблема з нагамі), рашыў пакатацца на ровары. Цікавіла мяне справа мадэрнізацыі электрычнай лініі ды хацелася паглядзець лес. Рамонт электраліній ў Кузаве пачаўся некалькі тыдняў таму. Цяжка вытрымаць без электрычнага току. Сабраўся я ўкамплектаваць на дыску тэксты сваіх допісаў (хачу выдаць кніжачку), а тут асечка... Час, даражэнькія, маланкава ўцякае і не прыкмеціш, калі кастуха ў дзверы загрукае. Таму выкарыстоўваю кожную хвіліну...

З хаты падаўся я перш-наперш у напрамку могільніка, дзе калісьці была звалка (зараз гміна забараніла вывозіць туды смецце). Але на жвіроўні нічога не перамянілася. Па-ранейшаму неахайныя прайдзісветы выкідаюць усялякае ламачча, забруджваюць лес побач могільніка. Брыдка гэта выглядае. Чуў, што гэта чарамшане, якія жывуць каля воданапорнай вежы, робяць гэты балаган. Ім бліжэй да Кузавы, чым на гмінную звалку каля насычальні. Мой сябрук прыкмеціў асобеня з фурай смецця, але не адважыўся папракнуць яго, бо не хацеў мужыку стаць ворагам. Вось як ставімся да грамадскай справы! А так быць не павінна.

Памятаю колішнюю гаворку пакойнага бацькі, які напамінаў, каб у Дабрывадскім лесе грыбоў з карэннем не вырываць. Не дай Бог, каб вясковец такое прыкмеціў — больш у лес не прапусціў бы такога грыбніка. „Вырываючы грыбочка з карэннем, — тлумачылі дабрывадцы, — грыбніцу знішчаем”. А кузаўцы на ўсё дазваляюць, можна ім смецце падкінуць, нават лес дагары нагамі перакуліць. З сумам пакідаў я вясковую сметніцу і пясчанай дарожкай падаўся ў напрамку „Ракітняга”.

Зараз у лесе вялікая засуха. Акуратная гравейка ператварылася ў пясчанае мора. Манцёры экскаватарам і машынамі так парылі дарогу, што не прайсці і не праехаць. А я задумаў з імі спаткацца і паглядзець як работа ідзе. Пашанцавала. На лясной прасецы прыкмеціў я экскаватар з рабочымі. Завялі мы гаворку. Манцёры патлумчылі, што паводле плана работу павінны закончыць да 15 мая, але магчыма, што справяцца раней (6 км лініі з Пагулянкі пад паравознае дэпо, як казалі, перабудаваць за некалькі тыдняў гэта вялікая справа). Паглядзеў я як заязмленне да лініі высокага напружання пракладалі. З тэхнікай хутка спраўляліся. Наракалі адно будаўнікі, што зямля засохлая.

— Немагчыма ямы свідраваць, — тлумачылі. — Пясок засыпаецца. Работа замаруджваецца...

Развітаўшыся з манцёрамі, лясным сцяжынкамі падаўся я дамоў. Лічыў, што пад Дабрывадай лепш будзе праехаць. Але памыліўся. Акуратная дарога неўзабаве перамянілася ў свежа заараную супрацьпажарную паласу, якая раздзяляе ўчасткі маладняку. Ледзь выкарабкаўся з пясчанай твані. Дахаты дабіраўся, не адчуваючы ног. Зразу ж на тапчан зваліўся. Аднак першы веснавы эскапад лічу ўдалым. Прыроду пабачыў ды тэму для допісу злавіў.

Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка

1. яго з песні не выкінеш, 2. напрыклад: КПЗБ, ПАРП, КПСС, 3. травень, 4. перадавы работнік вытворчасці, 5. майстар па вырабе бочак, дзежак, цаброў, 6. камплект друкарскіх літар пэўнага памеру і формы, 7. транспартны сродак для перавозу пасажыраў або грузаў па рэйкавых дарогах, 8. чаранок з пупышкамі для пасадкі, 9. рух з паступова нарастаючай скорасцю, 10. афрыканская сталіца насупраць Кіншасы, 11. прыстасаванне для верхавой язды, якое ўмацоўваецца на хрыбце жывёлы, 12. невялікая група службоўцаў для нагляду за парадкам або бяспекай.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — сенегальская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 18 нумара

Веер, дэбет, Йена, касец, ода, Янка, Ясь.

Рашэнне: **Не ссякай дрэва, якое дае табе цень.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 200 egz.

Зелянец у Скансэне

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

„Рэчанька” з Козлікаў

У нядзелю, 31 мая, у каталіцкі Зелянец, у Беластоцкім музеі вёскі ў Асовічах праводзіўся народны фэст. Прэзентаваліся народныя ўмельствы і фальклор падляшскіх гмін і паветаў. Вытворцы запрапанавалі свае майстэрскія вырабы. Шмат наведвальнікаў частавалася смачнай падляшскай ежай, набывала кулінарныя і гаспадарскія вырабы для сваёй сям'і і на падарункі. І ўсё пад музыку са сцэны, на якой прадстаўляўся абрад ваджэння каралеўны палёў, выступалі польскія і беларускія калектывы. Адкрыта была выстава „Дзіцячыя клопаты і гулі”, на якой пабачыць можна колішнія прылады, адзенне і цацкі малечаў Падляшша (выстава ў хатцы з Дубровы-Мачыдлаў, адкрытая да 31.10.2009 г.), можна таксама пагуляць на дзіцячай пляцоўцы абсталяванай цацкамі па ўзорах з мінулых гадоў. Язда з Беластока на Аўгустаў, можна на аўтобусе № 102, прыпынак ля гатэля „Вікінг”. Запрашае таксама беларуская хатка з Грыбоўшчыны!

Падмацаваўшыся такою ядою можна і воз цягнуць...

Фрагменты выставы „Дзіцячыя клопаты і гулі”

Гурт „Рада” Алеся Лося (са скрыпкай) з Мінска вучыў таксама і танцаў

Ваяры ў Скансэне

Дэпартамент культуры і нацыянальнай спадчыны Падляшскай маршалкоўскай управы пры супрацоўніцтве з Падляшскім музеем Беластоку запрашаюць **6 чэрвеня (субота) 2009 г., у гадзінах 12.00 — 20.00.** на мерапрыемства пад лозунгам ***Ад славян да жаўнераў верасня*** на тэрыторыі Музея вёскі ў Асовічах (даезд аўтобусам № 102). Прадстаўляцца там будуць м.інш. раннесярэдневяковыя ваяры ды групы гістарычнай рэканструкцыі з Беларусі і Літвы. Будуць і рамеснікі характэрныя для прэзентаваных эпох і іх вырабы. З канцэртам выступіць гурт „Стары Ольса” з Беларусі. Патранаж над мерапрыемствам трымаюць „Радыё Рацыя” і „Ніва”.

06.06 — 12.06

(22.03. — 20.04.) Можаш паспрачацца з асобай, з якой ты павінен быць у добрых стасунках. Гэта можа паслабіць тваю пазіцыю. Жыццё навучыць цябе развагі; абдуманасцю здабудзеш больш, чым рызыкай. Больш працы, перш за ўсё фізічнай — лепшы настрой.

(21.04. — 21.05.) Спакойна рэалізуй намеры на працы. Інтуіцыя цябе не падвядзе. 6-10.06. непатрэбныя нервы; сачы за кожнай дэталлю, не спазняйся. Выпадак можа вырашыць аб тваёй прафесійнай будучыні.

(22.05. — 22.06.) Не вельмі ўдалая першая палова месяца. Праўда, дасягнеш мэт, але кошты будуць высокія. Нейкае здарэнне давядзе да таго, што іначай глянеш на адносіны ў пары. Вельмі багатае духовае жыццё.

(23.06. — 23.07.) 6-9.06. можаш не мець матывіроўкі і знеахвоціцца да дзеянняў. Не дазволь, каб іншыя адвялі цябе ад вызначаных мэт! Толькі шчырая размова ўратуе адносіны з блізкай асобай.

(24.07. — 23.08.) Мудрасць, інспірацыя для змагання, сіла, каб не паддавацца выклікам лёсу. Але барукайся з лёсам выключна тады, калі разлічваеш на поспех. Каля 7.06. чакаюць цябе затрудненні, фінансавыя складанасці. Хтосьці можа адмовіцца ад падтрымкі, палічыць малаважнай тваю просьбу.

(24.08. — 23.09.) 7-11.06., дзякуючы падтрымцы знаёмых, зрэалізуеш свае планы. Падарожжа за мяжу — стрэл у „10”! Ды хтосьці будзе мець на цябе вялікі ўплыў, неабавязкова добры. Здароўе неблагое, але зважай на страўнік. 7-12.06. трымайся здалёк ад спраў ва ўстановах, а таксама грошай.

(24.09. — 23.10.) У першыя дні тыдня маеш шанц сустрэць каханне свайго жыцця. Не пазбягай сустрэч, часта бывай у людных, модных месцах. Захочацца амаладзіцца прынамсі на 10 гадоў. Спрыяць табе будуць нават ворагі. Хаця 6-10.06.: у бізнесе няма сяброў.

(24.10. — 22.11.) Найлепшыя дамовы падпішаш на пачатку тыдня. Стаў усё на адну карту — можаш выйграць (шмат што залежаць будзе ад тваёй настойлівасці)! У пачуццях — або ўсё, або нішто! Каханне, народжанае 6-10.06., будзе моцнае і жарснае. Выбары эксцэнтрычныя, ды трапныя.

(23.11. — 22.12.) Кінешся ў вір занняткаў. Нават па-за працай будзеш думаць аб абавязках. Але калі ты нават найлепшы на працы, можаш страціць у вачах шэфа і супрацоўнікаў з-за свайго зазнайства. Твае арагантныя паводзіны сягнуць піку 8-12.06. Затое ад 6.06. твой выгляд кіне ўсіх на калені!

(23.12. — 20.01.) Напачатку моцнае паніжэнне формы. Сам не будзеш верыць у сябе, іншыя гэта таксама прыкмецяць. Новае пачуццё можа развінуцца маланкава. Працаваць будзеш за двух, што прынясе вынікі. Добрыя вынікі лячэння, рэабілітацыі.

(21.01. — 19.02.) 7.06. (поўня Месяца) маеш шанц на добрую сустрэчу з сябрамі, шчырую размову. 7-11.06. заляціць у тваю галаву геніяльная ідэя, якая развяжа твае праблемы. Таму не турбуйся матэрыяльнымі і жыллёвымі клопатамі. 9-13.06. даведаешся, што шмат табе яшчэ трэба вучыцца, каб дайсці да намечанай мэты.

(20.02. — 21.03.) Рамантызм — эсенцыя жыцця для цябе ў гэты час. Можаш сустрэць каханне свайго жыцця! 7.06. будзь асцярожны з плёткамі; задоўгі язык можа пашкодзіць адносінам з кіраўніцтвам. 7.06. — пераломны момант на працы. 7-11.06. не абяцай таго, чаго ніяк не зможаш здзейсніць. Благі настрой рассейвай частым адпачынкам.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960